Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 103 (4007)
СЕРАДА, 15 КРАСАВІКА
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Хто забярэ бяспрытульную ільнамялку

КАЛОДЗІШЧЫ. (Наш кар.). Калгас «Бальшавік» (Калодзішчанскі сельсавет) мае садова-гародны шаўрамак. У гэтым калгасе ўжо больш 2-х месяцаў ляжыць пад адкрытым небам конная ільнамялка. Гота машына калгасу зусім непатрэбна. У той-жа час у іншых мясцох адчуваецца вялікі недахват ільнаапрацоўчых машын. Мясцовыя арганізацыі зусім не клапоцяцца, каб машына была адпраўлена ў ільнаводчы раён. Адпаведныя арганізацыі павінны прыняць меры і перакінуць ільнамялку туды, дзе яна патрэбна.

Аднаасобнікі забыты

ЕЛЬСК. НАДРЫХТОЎКАЙ ДА ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ АДНААСОБНАГА СЭКТРУ Ў ЕЛЬСКІМ РАЁНЕ НІХТО НЯ КІРУЕ. ПЛЯНЫ ПАСЕВАЎ ДА АДНААСОБНЫХ ДВАРОЎ ДАВОДЗЯЦЦА МЭХАНІЧНА, АДМІНІСТРАЦЫЙНЫМ ШЛЯХАМ, БЕЗ УСЯКАЙ РАСТЛУМАЧАЛЬНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ.

РАЙВЫКАНКОМ НЯ ЦІКАВІЦЦА І НЯ МАЕ НІЯКІХ ВЕСТАК АБ ХОДЗЕ РАМОНТУ С.-Г. ІНВЭНТАРУ, ЗАСЫПКІ НАСЕННЫХ І СТРАХАВЫХ ФОНДАЎ ПА ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ.

РАЁННЫ КАМІТЭТ СЯЛЯНСКАЙ УЗАЕМАДАПАМОГІ НЯ ПРЫМАЕ НІЯКАГА ЎДЗЕЛУ Ў НАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

14-ты ДЗЕНЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ

Калгасы БССР адказваюць тульскім рабочым

Калгасьнікі с.-г. арцеляй імя Дзяржынскага і „Авангард“ абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя „518“ і „1.040“

Зьдзельшчына і разьмеркаваньне прыбыткаў па колькасьці і якасьці затрачанай працы стварае самыя шырокія магчымасьці для разгортваньня масавага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах.

Укараняючы спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах, саўгасах і вёсках, бязьлітасна змагаючыся з кулаком даб'ёмся рашаючых посьпехаў на фронце другой бальшавіцкай сяўбы і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Ніводнага калгасьніка па-за ўдарнымі брыгадамі

„Пленум прапануе ўсім партарганізацыям правесьці шырокую праверку падрыхтаванасьці да сяўбы калгасаў, саўгасаў, МТС і аднаасобнага сэктару, арганізоўваючы у гэтых мэтах пробныя выезды ў поле, разгарнуць сацыспаборніцтва і ўдарніцтва вакол выкананьня задач падрыхтоўкі да сяўбы, скончыць падрыхтоўку збруі, інвэнтару і харчовых рэзэрваў“

(З пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б)

Менск, 15 красавіка

Грандыёзны рост народнай гаспадаркі Савецкага Саюзу, стварэньне раду новых прамысловых гігантаў, вялізарныя посьпехі сельскай гаспадаркі, якая перабудоўваецца на сацыялістычны лад, натхнілі працоўных СССР на барацьбу за новыя перамогі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Адозва рабочых тульскага заводу да рабочых і калгасьнікаў з прапановай адзначыць гадавіну сацспаборніцтва абвяшчэньнем Усесаюзнай перакліччы па ўсіх колькасных і якасных паказальніках, з прапановай абвясьціць новы набор ударнікаў імя 518 новых фабрык і заводаў і 1.040 МТС, — зьяўляецца яркім адлюстраваньнем тэго натхненьня і ўздыму, якія выклікалі сярод рабочых і ўсіх працоўных перспэктывы нашага росту.

Сёньня мы падаем водгукі перадавых калгасаў БССР на адозву тулякоў. Калгасы імя Дзяржынскага (Дрысенскі раён) і «Авангард» (Расонскі раён), рапартуючы аб выкананьні агра-выторчых мерапрыемстваў да вясны, уключаюцца ва Ўсесаюзную перакліччку. Абвяшчаючы сябе ўдарнымі, яны бяруць на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў, якія забясьпечваюць выкананьне і перавыкананьне задач другой калгаснай вясны. У цэнтры увагі імі пастаўлена работа па ўцягненьні ў калгасы новых мас аднаасобнікаў беднякоў і сярэднякоў і ўкараненьне сацыялістычных мэтадаў працы. Абодва калгасы, як першачарговую задачу, ставяць перад сабой пытаньні тэхнічнага замацаваньня калектыўных гаспадарак, ліквідацыю абязьлічкі і арганізацыю працы на прынцыпах зьдзельшчыны. Калгасная маса гэтых арцеляй добра разумее, што толькі зьдзельшчына і разьмеркаваньне прыбыткаў па колькасьці і якасьці затрачанай працы стваравае шырокія магчымасьці для разгортваньня масавага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах.

Калгасьнікі арцеляй імя Дзяржынскага і «Авангард» высоўваюць таксама перад кожным калгасьнікам на першы плян задачу авалоданьня тэхнікай. Кожны калгасьнік і калгасьніца павінны ўмець працаваць на трактары, на сельска-гаспадарчай машыне, павінны быць агра-пісьменнымі.

Члены калгасу імя Дзяржынскага абавязаліся ўцягнуць у свой калгас да канца 1931 году аднаасобнікаў 4-х вакольных вёсак. Гэты калгас кліча ўсе калгасы і аднаасобнікаў адгукнуцца на адозву тульскіх рабочых, арганізаваць новую магутную хвалю калгаснага прыпіву, па-ўдарнаму завяршыць падрыхтоўку да сяўбы і па-бальшавіцку правесьці надыходзячую веснавую сяўбу.

БССР напярэдадні палявых работ. Неабходна ў бліжэйшым-ж дні завяршыць падрыхтоўку да сяўбы. Посьпех другой бальшавіцкай вясны будзе ў першую чаргу залежыць ад вырашэньня задач арганізацыі працы, ад таго, наколькі мясцовыя арганізацыі здолеюць скарыстаць вялізарную актыўнасьць і ўздым мас для барацьбы з труднасьцямі, а апартуністамі і кулаком. Для таго, каб ва ўсеўзбраеньні сустрэць вясну, трэба неадкладна ліквідаваць тыя недахопы, якія мы маем на рашаючых участках — па лініі насеньня, цагавай сілы, арганізацыі працы. Практыка мінулага году, практыка раёнаў раньняй сяўбы паказвае, што ўсе гэтыя прарывы можна з посьпехам і поўнасьцю ліквідаваць на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Прызыў калгасьнікаў арцеляй імя Дзяржынскага і «Авангарда» павінен быць падхоплен усімі калгасамі і вёскамі. Калгасы БССР павінны адказаць тульскім рабочым неадкладным разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, і ліквідацыяй на гэтай аснове тых прарываў, якія ёсьць у падрыхтоўцы да вясны.

ЗАДАЧА МЯСЦОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ПРАВЕРАЧНЫХ БРЫГАД У ДНІ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ, ЯКІЯ ЯШЧЭ ЗАСТАЛІСЯ. АРГАНІЗАВАЦЬ ГЭТЫ МАСАВЫ РУХ ЗА ЎКАРАНЕНЬНЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ФОРМ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ, СТАЎЦЫ НА ЧАЛЕ АКТЫЎНАСЬЦІ КАЛГАСНЫХ МАС ВАКОЛ ЗАДАЧ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ.

Лепшай падрыхтоўкай да другой гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва зьявіцца бальшавіцкае завяршэньне падрыхтоўкі да сяўбы, ударнае правядзеньне другой калгаснай вясны пад лёзунгам суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класы на гэтай аснове, выкананьне і перавыкананьне намечаных вытворчых плянаў у саўгасах, калгасах і індывідуальным сэктары.

НІ АДНАГО КАЛГАСЬНІКА ПА-ЗА ЎДАРНЫМІ БРЫГАДАМІ. НІ АДНАГО КАЛГАСУ БЕЗ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ НА ПРЫНЦЫПАХ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ АЦЭНЕНАЙ У ПРАЦА-ДНЕХ, БЕЗ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ МЭТАДАЎ ПРАЦЫ. Гэтыя лёзунгі павінны стаць галоўнымі лёзунгамі дня.

Апіраючыся на калгасьнікаў, бязьлітасна змагаючыся з кулаком і арганізуючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах, саўгасах і вёс- [illegible] ПАСТАНОВЫ КРАСАВІЦКАГА ПЛЕНУМУ ЦК і ЦКК КП(б)Б [illegible] на другой бальшавіцкай сяўбы, новых [illegible] ударнікаў [illegible]

БЮЛЕТЭНЬ № 13

Пераход калгасаў на зьдзельшчыну зьяўляецца рашаючай умовай правільнай арганізацыі і ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы ў калгасах і пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы.

Зьдзельная аплата працы, вылічаная ў працаднёх, моцна ўдарыць па гультаёх, па аматарах пажывіцца за кошт чужой працы, дапаможа выкараніць нядбайныя адносіны да калгаснай гаспадаркі.

Партыя і ўрад далі катэгарычную дырэктыву скончыць перавод калгасаў на зьдзельшчыну не пазьней 15-га красавіка.

Весткі, з раёнаў, якія мы сёньня падаем паказваюць, што на мясцох усё яшчэ не ўявілі сабе ўсёй важнасьці пастановы VI Усесаюзнага зьезду саветаў аб пераходзе калгасаў на зьдзельшчыну.

Не сёньешні дзень па БССР з 5.820 калгасаў пераведзена на зьдзельшчыну толькі 661 калгас. 60 раёнаў зусім яшчэ не адказалі на запытаньне аб тым, што імі зроблена ў галіне пераводу на зьдзельшчыну. Такія раёны як Ветрынскі, Лагойскі, Вульскі яшчэ не прыступілі да выкананьня гэтай важнейшай справы, там усё яшчэ «абмяркоўваюць»...

На фоне бязьдзейнасьці большасьці раённых арганізацый у справе пераводу на зьдзельшчыну асабліва значэньне набывае, дакумэнты намі сёньня адкрытага пераводзога калгасу імя Дзяржынскага (Дрысенскі раён), на заклік тульскіх рабочых. Дзяржынцы абавязаліся поўнасьцю і ў вызначаныя тэрміны скончыць сяўбу, выканаць усе гаспадарчыя заданьні, ліквідаваць абязьлічку ва ўсіх галінах працы, правёўшы ўсю работу на зьдзельшчыну. 15 маладых дзяржынцаў абязьцілі сябе ўдарнікамі імя «518» і «1.040».

Усе калгасы БССР павінны пасьледаваць іх прыкладу—падвоіць тэмпы падрыхтоўкі да другой калгаснай вясны, безадкладна перавесьці ўсю работу на зьдзельшчыну, пашырыць рады ўдарнікаў калгаснай вёскі.

Атрыманыя намі весткі з ВУЛЬСКАГА і НАРАЎЛЯНСКАГА раёнаў сьцвярджаюць аб разбазарваньні насенных і кармавых фондаў, якое мае месца ў радзе калгасаў. У калгасе «АСЬВЕТА» (Вуля) ужо скармілі для жывёлы звыш 33 цэнтнэраў насеннага аўса. Зараз узяліся за насенную бульбу. Аднаасова ні ў адным калгасе Вульшчыны ня ўжываюць ветачнага корму, які ў сучасны момант можа замяніць дэфіцытныя кармы.

У Нараўлянскім раёне ў калгасе «Зьвязда» 34 цэнтнэры насеннага ільну разбазарылі на корм жывёлы. У калгасе «ЦЕШКАЎ» 50 цэнтнэраў насеннага аўса, таксама пайшло на корм. Характэрна адзначыць, што разбазаранае насеньне—гэта пішкі, якія ёсьць у гэтых калгасах.

Гэтыя факты паказваюць, што ў радзе раёнаў усё яшчэ нічога ня робіцца для мабілізацыі мясцовых насенных і кармавых рэсурсаў. З разбазараньнем кармоў і насеньня невядзецца ніякай барацьбы. У той-жа час у Менск пасылаюцца тэлеграмы з патрабаваньнямі аб завозе насеньня.

Гэткім агідным зьявішчам неабходна зараз-жа пакласьці канец. Раённыя арганізацыі павінны сапраўды па-баявому ўзяцца за выяўленьне пішкаў насеньня і фуражу ў сябе на мясцох, за разьмеркаваньне гэтых пішкаў паміж тымі калгасамі, якія асабліва адчуваюць востры недахоп кармоў і насеньня. Толькі такім шляхам мы забясьпечым пасьпяховую падрыхтоўку да сяўбы, забясьпечым калгасы насеньнем і фуражом.

Калгасы Клімаўшчыны

перавыкананьні плян кантрактацыі

КЛІМАВІЧЫ.

ПЕРШАЯ ДЭКАДА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ ДАЛА ЗНАЧНЫ ЗРУХ У ГАЛІНЕ КАНТРАКТАЦЫІ. НА 10-га КРАСАВІКА ПА КАЛГАСАХ ПЛЯН КАНТРАКТАЦЫІ ВЫКАНАН З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ — У РАЗЬМЕРЫ 106,6 ПРОЦ. І ПА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ — 87,2 ПРОЦ. ЗАКАНТРАКТАВАНА ІЛЬНУ Ў КАЛГАСАХ 103,4 ПРОЦ., У АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ—95 ПРОЦ. ПЛЯНАВАГА ЗАДАНЬНЯ.

ГЭТЫХ ПОСЬПЕХАЎ РАЁН ДАСЯГНУЎ ДЗЯКУОЧЫ ШЫРОКАЙ РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОЦЕ, ЯКАЯ БЫЛА ПРАВЕДЗЕНА ВА АПОШНІ ЧАС АМАЛЬ ПА ЎСІХ СЕЛЬСАВЕТАХ. ДЛЯ ГЭТАЙ РАБОТЫ БЫЎ МАБІЛІЗОВАН УВЕСЬ РАЁННЫ І ВЯСКОВЫ АКТЫЎ. НА СХОДАХ ДЭТАЛЬНА РАСТЛУМАЧВАЛАСЯ СЯЛЯНАМ ЗНАЧЭНЬНЕ КАНТРАКТАЦЫІ І ПАСТАНОВЫ VI-га ЎСЕСАЮЗНАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ.

КУЛАКІ, ЯКІЯ ПРАБАВАЛІ ПЕРАШКАДЖАЦЬ ЗАКЛЮЧЭНЬНЮ КАНТРАКТАЦЫЙНЫХ ДАГАВАРОЎ, АТРЫМАЛІ РАШУЧЫ АДПОР З БОКУ КАЛГАСНЫХ І БЎДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС ВЁСКІ.

БРЫГАДЗІР «ЗЬВЯЗДЫ». ПАШКЕВІЧ.

„Аформіць дагавары пасьпеем“

Так разважаюць у Халопеніцкім райкалгассаюзе

Кантрактацыя праводзіцца без удзелу мас

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Наш кар.). Плян кантрактацыі ў Халопеніцкім раёне на 11-га красавіка выканан толькі ў разьмеры 60,3 проц. Тэрміны, вызначаныя для скончэньня работы па кантрактацыі, ужо прайшлі. Прычыны адставаньня раёну заключаюцца ў апартуністычнай бязьдзейнасьці некаторых раённых арганізацый.

Райкаапільнасаюз не забясьпечыў кіраўніцтва гэтай важнейшай справай. Старшыня райкаапільнасаюзу Хаменка прасядзеў у Хацюхоўскім сельсавеце два тыдні і, нічога там рэальнага не зрабіўшы тэрмінова выехаў у Менск па асабістых справах.

Чырвона-Луцкі сельсавет толькі 5-га красавіка атрымаў блытаныя дырэктывы райкаапільнасаюзу і блянкі для афармленьня дагавароў.

У Грыцкаўскім сельсавеце старшы брыгадзір райпалітінспэктар Жыўко падышоў да кантрактацыі фармальна, пабюракратычнаму, не аформіў дагаворў на сходах сялян, а абмежаваўся толькі подпісам старшыні сельсавету, г. зн. што бедняком і сярэдняком ня было растлумачана значэньне кантрактацыі. Работа была праведзена ў канцылярыі сельсавету бяз удзелу мас.

Ня лепшая справа і ў Кашчынскім і Баранскім сельсаветах. Сакратары партячэек гэтых сельсаветаў — Шэлак і Ляўчун знаходзяцца ў баку ад гэтай важнейшай работы і нічога не зрабілі для мабілізацыі вясковага актыву па правядзеньне кантрактацыі.

У райкалгассаюзе разважаюць: «Няма маса арганізаваная, мы пасьлем аформіць дагаворы па калгасах».

Зразумела, такія апартуністычныя разважаньні прывялі да таго, што плян кантрактацыі ня выканан.

Раённыя арганізацыі павінны ў другой дэкадзе генэральнай праверкі дасіпка рашучага зруху ў галіне кантрактацыі шляхам шырокай растлумачальнай работы сярод бядняцка-сераднякіх і калгасных мас, шляхам арганізацыі належнага адпору ўсякім кулацкім спробам перашкаджаць правядзеньню кантрактацыі.

Трактары гаручым не забясьпечаны

ЛОЕЎ. (Наш кар.).

Лоеўскі раён зьяўляецца раённым раньняй сяўбы. Між тым, трактары тут не забясьпечаны гаручым. Неадпаразовыя просьбы да Белкаапсаюзу паскорыць дастаўку гаручага, бо ўжо канчаецца санная дарога, вынікаў не далі.

Адсутнасьць гаручага затрымаць разгортваньне работы трактараў.

М. Р.

Махоркі сеяць не жадаюць

Арганізацыі Каралінскага раёну ўсё яшчэ вядуць торг з Наркамзэмам адносна плянту сяўбы махоркі. Каралінскае дала заданьне засеяць гэтай культурай 60 гэкт., а раённыя арганізацыі скарачаюць гэту лічбу да 25 гэкт.

Нічога практычнага на робіцца ў галіне кантрактацыі насеву махоркі. За [illegible] кантрактавана [illegible] гэкт. Работы [illegible] ня вырашэнае [illegible] вясковых арганізацыя.

Прыблізна такая [illegible] кантрактацыі махоркі ў [illegible]

Рабочая сіла не арганізавана

Марудзяць з пераводам на зьдзельшчыну

БАГУШЭЎСК. (Наш кар.). Саўгас «Дзедслава-Пашкова» яшчэ ня скончыў падрыхтоўкі да сяўбы. Інвэнтар у саўгасе адрамантаваны, насеньне і кармавыя фонды створаны, але нічога ня зроблена ў галіне арганізацыі працы.

Саўгас яшчэ не перайшоў да гэтага часу на зьдзельшчыну, саўгасьнікі не разьбіты на брыгады, рабочыя не прымацаваны да пастаянных работ.

Пры саўгасе ёсьць трактар, але праўленьне трэсту загадала гэты трактар перадаць арцелі «Прагрэс». Перадача трактара зьяўляецца нэгрэбальнай, бо саўгасу «Дзедслава-Пашкова», у сувязі з недахватам рабочай сілы, трактар [illegible] патрэбны.

Нічога не зроблена для арганізацыі [illegible] і [illegible] жывёлы, у сувязі з [illegible] чыя жывёла, праца на можа быць [illegible]

Новыя калгасы застаюцца бяспрытульнымі

Полацкія райарганізацыі недаацэньваюць гаспадарчага замацаваньня калгасаў

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Полацкі раён да гэтага часу належным чынам яшчэ ня ўключыўся ў работу па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны. Рад калгасаў не абагулілі рабочую гужавую сілу, ня скончылі рамонту інвэнтару, не ачысьцілі насеньня.

Райкаапсаюз і райкалгассаюз невыстарчальна разгарнулі работу па дапамозе новым калгасам, што стварае пагрозу несвачасовага выхаду іх у поле.

Партыйныя арганізацыі таксама не аддаюць належнай увагі замацаваньню новаарганізаваных калгасаў, лічачы, што іх справа толькі весьці арганізацыю прыліву ў калгасы, а справа замацаваньня іх не датычыць.

У камуне «Чырвоны артыперыст» Махіраўскага сельсавету да гэтага часу не прыступілі да рамонту трактараў. Сельска-гаспадарчая майстэрня ў Полацку алмовілася зрабіць рамонт, а праўленьне камуны ня прымае ніякіх мер да ліквідацыі гэтага прарыву ў падрыхтоўцы да сяўбы.

На Полаччыне адчуваецца недахват кармоў. Страхавыя фонды ня створаны. Буйны калгас «Новае жыцьцё» Баярскага сельсавету скарыстоўвае страхавы фонд на кормы.

Кантрактацыя яравых пасеваў праходзіць таксама вельмі слаба. Плян кантрактацыі яравых культур па калгасах выканан на 50 проц., па садох—на 48 проц., гародніне—51,6 проц.

Індывідуальны сэктар кантрактацыйнымі дагаворамі сярод бядняцка-сераднякіх не ахоплен. На сёньешні дзень па індывідуальным сэктары яравых культур закантрактавана 3 проц., гародніны—2 проц.

Трэба адзначыць, што і гэтыя мізэрныя лічбы выкананьня плану кантрактацыі палаюць толькі на 2 сельсаветы. Рэшта сельсаветаў да кантрактацыі ў аднаасобным сэктары не прыступіла.

Побач з гэтым некаторыя калгасы сапраўды па-баявому узяліся за выкананьне плянаў кантрактацыі. Так, камуна «Чырвоны артыперыст» сваё заданьне выканала на 100 проц.

Калгас «Кастрычнік», Юравіцкага сельсавету, поўнасьцю гатоў да выхаду ў поле. Аднаасобнікі в. Дворэц, бачачы пасьпяховую падрыхтоўку калгасу да сяўбы, арганізаваліся ў аддзяленьне калгасу.

У тых сельсаветах, дзе была разгорнута масавая работа, наглядаецца ўмацаньне калгаснага руху. Так, па Мацісінскім сельсавеце процант калектывізацыі ўзрос да 37. Алесаўскі сельсавет калектывізаваны на 40 проц. Толькі за апошнія некалькі дзён у гэтым сельсавеце арганізавана 5 новых калгасаў.

Арпінскі сельсавет таксама дабіўся зруху ў разгортваньні калектывізацыі. Замест 13,5 проц. калектывізацыі сельсавет на сёньешні дзень калектывізаваны на 27 проц. Сельсавет абавязаў сябе ўдарным, але ўдарных тэмпаў у рабоце сельсавету не адчуваецца.

Бальшавікаму правядзеньню палітыка-гаспадарчых кампаній перашкаджае тое, што некаторыя калгасы засьмечаны варожымі элементамі, кулакамі і асобамі, пазбаўленымі выбарчых правоў.

Усе гэтыя недахопы трэба выкараніць. Грамадзкасьць і партыйныя арганізацыі павінны мабілізавацца на бальшавіцкае правядзеньне чарговых задач партыі і ўраду на вёсцы.

А. Ц

Спажываюць насенныя фонды

ВУЛЯ. (Наш кар.). Калгас «Асьвета», Вульскага сельсавету, пачаў ужываць на корм для жывёлы насенны авёс і бульбу. Аўса скормлена 200 пудоў. Зараз маюць намер пусьціць у корм 2.000 пудоў бульбы. Такія адносіны да насенных фондаў могуць прывесьці калгас да таго, што яму ня будзе чым сеяць.

Па Вульскім раёне ні адзін калгас ня ўжывае корму з вецьцяў. Гэтай справай райкалгассаюз зусім ня цікавіцца.

МІКУЦКІ.

„ПРАПАНОВА РАБОЧЫХ РЫГОРА І ЯНКІ КАЖАМЯКІНЫХ

„Абвяшчаем сябе ўдарнікамі па рамонце інвэнтару падшэфнага нам калгасу“

У сувязі з прарывам на вучастку рамонту калгаснага інвэнтару і машын, недахопам кваліфікаваных рамонтных рабочых у калгасах, рабочыя торфазаводу «Шлях сацыялізму» т. т. Кажамякін Рыгор і яго сын Янка падалі ў партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі заводу заяву, у якой, між іншым, пішуць:

«Разам з сынам абвяшчаем сябе ўдарнікамі па рамонце сельска-гаспадарчага інвэнтару падшэфнага нам калгасу ў Карменскім сельсавеце. Рамонт будзем вытвараць пасьля скончэньня рабочага дня на заводзе».

Адначасова Кажамякіны выклікалі пасьледаваць іх прыкладу рабочых буйнейшай у БССР папяровай фабрыкі «Герой працы» і прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў сельскіх месцасьлях, або бліжэй ад вёсак, [illegible] дапамогі калгасам пасьля скончэньня [illegible] на прадпрыемствах, каб да ўдарнага перыяду зарэкамендаваць у калгасах [illegible] ня выканаецца [illegible]

За сацыялістычныя формы працы імя „518“ і „1040“

абвясьцілі сябе ўдарнікамі калгасьнікі арцелі „Авангард“

РАСОНЫ. (СЬПЕЦІЯЛЬНАЙ ПОШТАЙ).

МЫ, КАЛГАСЬНІКІ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ АРЦЕЛІ «АВАНГАРД» З ДЗЬМІТРАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, ПРЫМАЕМ ЗАКЛІК РАБОЧЫХ ТУЛЬСКАГА ЗАВОДУ І ЗАКЛІКАЕМ УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ РАСОНСКАГА РАЁНУ НА-ЎДАРНАМУ ПРАВЕСЬЦІ ДРУГУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ СЯЎБУ, ЦАЛКАМ ВЫКАНАЎШЫ ПАСЕЎНЫЯ ПЛЯНЫ, АСАБЛІВА ПА ІЛЬНЕ І КАНОПЛЯХ.

МЫ АБВЯШЧАЕМ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ ІМЯ «518» І «1040» І ЗАКЛІКАЕМ УСІХ БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ НАШАГА РАЁНУ ЎСТУПІЦЬ У КАЛГАСЫ.

РАПАРТУЕМ, ШТО НАШ КАЛЕКТЫЎ ПОЎНАСЬЦЮ ЎЖО АДРАМАНТАВАЎ ІНВЭНТАР, ЗАБЯСЬПЕЧЫЎ СЯБЕ НАСЕНЬНЕМ НА 100 ПРОЦ., СКОНЧЫЎ АЧЫСТКУ НАСЕНЬНЯ.

ЗАРАЗ МЫ ПЕРАХОДЗІМ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ, АЦЭНЕНУЮ Ў ПРАЦАДНЯХ. ЗАКЛІКАЕМ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА, НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ КАЛГАС «ЧЫРВОНАЯ ДУБРОВА» І АДНААСОБНІКАЎ ЧАРЭЙЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ.

НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ФОРМЫ ПРАЦЫ!

ДАМО СЫРАВІНУ НОВЫМ ФАБРЫКАМ І ЗАВОДАМ!

АГУЛЬНЫ СХОД КАЛГАСУ «АВАНГАРД».

3-га павінен апрацаваць кожны трактар

Сац. спаборніцтва паміж Буда-Кашалёўскімі Ўраравіцкімі трактарнымі калёнамі

Трактарысты БУДА-КАШАЛЁЎСКАЙ трактарнай калёны, улічваючы важнасьць другой бальшавіцкай вясны і выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва трактарыстаў УВАРАВІЦКАЙ трактарнай калёны.

Умовы спаборніцтва наступныя:

Дабіцца поўнай спраўнасьці трактараў і прычэпных машын да выезду ў поле і не пазьней 15-га красавіка даставіць трактары, змазачны і гаручы матар'ял на месца работы.

Кожны трактар пры рабоце ў дзьве зьмены павінен апрацаваць ня менш 3 гэкт. пры добраякасным форыве.

Простої трактараў давесьці да нуля, зжыць выпадкі псаваньня трактараў і машын. Апошнія трымаць заўсёды ў чыстаце, для чаго штодзённа рабіць чыстку машын. Дабіцца найбольш эканомі гаручага і змазачнага матар'ялу.

Для штодзённай праверкі ходу спаборніцтва трактарысты парашылі завесьці пастаянны ўлік работы трактараў, выдаткаваньня гаручых і змазачных матар'ялаў.

Вульшчына ў глыбокім тыле

ВУЛЯ. (НАШ КАР.). НА 10-га КРАСАВІКА ПА КАЛГАСАХ ВУЛЬШЧЫНЫ ЗАКАНТРАКТАВАНА 719 ГА, ШТО СКЛАДАЕ 50,4 ПРОЦ. ПЛЯНУ. БУЛЬБЫ ЗАКАНТРАКТАВАНА 9,3 ПРОЦ., ВІКІ — 4,1 ПРОЦ., ІЛЬНУ — 63 ПРОЦ.

ЯШЧЭ ГОРШ ІДЗЕ КАНТРАКТАЦЫЯ ПА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ. ТАК, АЎСА ЗАКАНТРАКТАВАНА 6,8 ПРОЦ., ЯЧМЕНЮ—5,8 ПРОЦ., ГАРОХУ —3,2 ПРОЦ., ІЛЬНУ—6,8 ПРОЦ., ВІКІ—7 ПРОЦ., ТРАЎ — 11 ПРОЦ., А Ў СЯРОДНІМ АДНААСОБНЫМ СЭКТАР ЗАКАНТРАКТАВАЎ ПА РАЁНЕ ТОЛЬКІ 6,7 ПРОЦ.

ПА АБОДВУХ СЭКТАРАХ КАНТРАКТАЦЫЯ ПРАВЕДЗЕНА ТОЛЬКІ НА 16,1 ПРОЦ. ГЭТЫЯ ЛІЧБЫ ВЫРАЗНА ГАВОРАЦЬ АБ ПОЎНЫМ ЗРЫВЕ КАНТРАКТАЦЫІ Ў ВУЛЬСКІМ РАЁНЕ. НЕАБХОДНА ЎЖЫЦЬ САМЫЯ РАШУЧЫЯ МЕРЫ, МАБІЛІЗАВАЎШЫ ЎВЕСЬ РАЁННЫ АКТЫЎ, І ДАВІЦЦА ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНАЎ КАНТРАКТАЦЫІ.

МІКУЦКІ.

Дайце калгасам інструкцыі

ВУЛЯ. (Наш кар.). Пытаньне аб пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну па Вульскім раёне было абгаворана разам з пастановамі VI зьезду саветаў, але справа далей абгаварэньня ня пайшла. Да гэтага часу на зьдзельшчыну не пераведзен ні адзін калгас. Райкалгассаюз гэта пагаладзіўся аб тым, каб забясьпечыць калгасы інструкцыяй аб зьдзельшчыне.

МІКУЦКІ.

Толькі 661 калгас

ПЕРАВЕДЗЕНЫ НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ

Лагойскі і Ветрынскі раёны не прыступілі да выкананьня важнейшай дырэктывы партыі

13 красавіка мы зьмясьцілі зводку Белкалгаспэнтру аб пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну. З 1.388 калгасаў на 22 раёнах былі пераведзены на зьдзельшчыну толькі 353 (25,4 проц.).

Сёньня мы зьмяшчаем новую зводку аб пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну ў наступных 16 раёнах.

РАЁН	Усяго калгасаў.	Пераведзена на зьдзельшчыну.	% выкананьня
Рагачоўскі	81	20	25
Вузьлянскі	49	7	14,5
Ветрынскі	38	—	—
Аршанскі	92	31	33,7
Гроскі	60	15	25
Расьнянскі	50	20	40
Сьвіслацкі	40	39	97,5
Старобінскі	44	12	27,2
Хойніцкі	66	30	45,4
Гарадоцкі	41	07	17
Барэзінскі	62	18	28,8
Магілёўскі	99	40	40
Ляднянскі	37	14	38
Тураўскі	30	9	30
Чавускі	80	46	57,5
Лагойскі	57	—	—
УСЯГО	928	308	33,2

Ветрынскі і Лагойскі раёны, як відаць вышэй, зусім нічога не зрабілі для выкананьня важнейшай дырэктывы партыі.

Папярэдняя праверка пераводу калгасаў на зьдзельшчыну паказвае, што на рад намыслаў, якія былі дапушчаны па мясцох.

Так, у радзе калгасаў Сьвіслацкага раёну на зьдзельшчыну пераведзены толькі паасобныя віды работ і па гэтым супакойліся.

Ёсьць выпадкі, калі ўлік праробленай працы пры пераводзе на зьдзельшчыну робіцца ў гадзінах, як пры падзёмшчыне, а не ў працаднёх, улічваючы характар работы.

У некаторых калгасах невыстарчальна прапрацаваны нормы выпрацоўкі. Зусім слаба растлумачваецца і праводзіцца ў жыцьцё групавая зьдзельшчына.

Сёньня апошні тэрмін, вызначаны партыяй і ўрадам для пераводу калгасаў на зьдзельшчыну. Прыведзеная вышэй зводка паказвае, што большасьць раённых арганізацый ня выканалі гэтай важнейшай дырэктывы. На мясцох незвапаньваецца значэньне зьдзельшчыны для правільнай арганізацыі працы ў калгасах, узьнімцця калгаснай вытворчасьці і правядзеньня веснавой сяўбы.

Да 1-ай Менскай канфэрэнцыі прафсаюзаў

1-я Менская канфэрэнцыя прафсаюзаў, якая прадстаўляе 50.000 атрад членаў саюзу, праходзіць ва ўмовах, калі рабочая клясa пад кіраўніцтвам ленінскай партыі вядзе рашучае наступленне на капіталістычныя элементы па ўсім фронце, руйнуючы спробы апартуністаў затрымаць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, даючы рашучы адпор атакам клясавага ворага—кулаком, нэпманам, шкоднікам, нацыяналістам і іх агентуры ў радох партыі—нацыянал-апартуністам.

На аснове генеральнай лініі партыі рабочая клясa дасягнула вялізарных поспехаў на ўсіх участках будаўніцтва сацыялізму. Пытаньне «хто каго» ў прамысловасьці вырашана беспаваротна, на карысьць пралетарыяту, мы падыходзім таксама да вырашэньня пытаньня «хто каго» ў галіне сельскай гаспадаркі. На аснове суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца апошняя апора капіталізму ў СССР—кулацтва.

Ініцыятыва, энтузіязм, магутны ўздым рабочых мас праз шырока разгорнутыя камуністычныя формы працы—сацспаборніцтва і ударніцтва—вось тая невычарпальная крыніца ў рабочай клясе, якая забяспечыла ажыцьцяўленьне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Вызваленьне кіраўніцтва прафсаюзаў ад правааапартуністычных элементаў спрыяла больш шырокаму прыцягненню членаў прафсаюзаў да непасрэднага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Новае кіраўніцтва прафсаюзаў дабілася значных поспехаў у справе ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, скіраваны на пале магутнага ўздыму рабочых мас.

«ВЫКАНАНЬНЕ ВЯЛІЗАРНЫХ ЗАДАЧ, ЯКІЯ СТАЯЦЬ ПЕРАД ПРАФСАЮЗАМІ Ў ГАЛІНЕ РАЗГОРТВАНЬНЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, АСАБЛІВА ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ, ПАТРАБУЮЦЬ УСЯМЕРНАГА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ВЫТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ ПРАФСАЮЗАЎ І ШТОДЗЕННЫХ КЛОПАТАЎ АБ МАТАР'ЯЛЬНЫМ І КУЛЬТУРНА-БЫТАВЫМ АБСЛУГОЎВАНЬНІ РАБОЧЫХ». Так выразіў вызначэньне задачы прафсаюзаў на даным этапе 5-ты пленум УсеЦСПС.

Менскай гарадзкой канфэрэнцыя прафсаюзаў, якая сёньня адкрываецца, павінна прайсьці пад знакам ПРАВЕРКІ тае, як менскія прафарганізацыі працавалі сваю штодзенную работу ў напрамку поўнага забеспячэньня паваротку гэтарам па канкрэтных палітычна-гаспадарчых задач і штодзенных клопатаў аб матар'яльным і культурна-бытавым абслугоўваньні рабочых. Сапраўднае давяраньне да кожнага члена прафсаюзу пастаноў 5-га пленуму і хутчэйшае ажыцьцяўленьне іх патрабуюць самай шырокай крытыкі і самакрытыкі работы сяброўных арганізацый, праверкі, як яны павярнуліся да цэху, зьмены, брыгады, групы і г. д. Канфэрэнцыя павінна прайсьці пад знакам далейшай непрымірымай барацьбы з апартуністычнай недастатковай перабудовы прафсаюзнай работы.

Пастановы партэрганаў І ЦСПСБ аб арганізацыі Менскага гарпрафсавету ёсьць адзін з тых крокаў, які набліжае прафкіраўніцтва да вытворчасьці.

Асноўныя задачы гарадзкога савету прафсаюзаў цалкам вынікаюць з пастаноў XVI зьезду УсеКП(б), XIII зьезду КП(б)Б і V пленуму УсеЦСПС. Рашучае змаганьне за выразнае і поўнае правядзеньне ў жыцьцё гэтых пастаноў, мабілізацыя шырокіх прафсаюзных мас на іх ажыцьцяўленьне, барацьба супроць кажэнькаў лініі партыі ў практычнай рабоце—вось асноўная задача гарпрафсавету.

Вялізарныя задачы трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуюць яшчэ большага разгортваньня камуністычных мэтадаў працы праз далейшую арганізацыю «сквозных» брыгад, плянава-апэрацыйных груп, сустрэчных плянаў і г. д. Наяўнасьць прарываў у выкананьні прамфінпляну першага кварталу 1931 г. па радзе прадпрыемстваў Менску патрабуе ад гарпрафсавету і ад усёй пралетарскай грамадзкасьці прыняць усе захады, каб пры ДАПАМОЗЕ НАЙХУТЧЭЙШАЙ ПЕРАБУДОВЫ ПРАФРАБОТЫ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ І ЎСТАНОВАХ ЗАБЕСПЕЧЫЦЬ ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВАЎ, ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНАЎ.

Жывы водгук на АДОЗВУ ТУЛЬСКІХ РАБОЧЫХ з боку пралетарскай грамадзкасьці Менску, які выліўся ў арганізацыі новых ударных брыгад, высоўваньні сустрэчных норм выпрацоўкі і г. д., павінен быць цалкам выкарыстаны, каб да VII зьезду прафсаюзаў БССР і IX зьезду СССР поўнасьцю ліквідаваць прарывы і прыйсьці з новымі перамогамі на фронце барацьбы за прамфінплян. Рашуча выкрываючы ілжэ-ўдарнікаў, якія зрываюць выторчыя заданьні, трэба лапш паставіць справу заахвочаньня лепшых ударнікаў, праводзячы гэта не габінэтна, а пры ўдзеле шырокіх мас.

Адзін з адказьнейшых задач гарпрафсавету на бліжэйшы час зьяўляецца МАБІЛІЗАЦЫЯ ПРАФСАЮЗНЫХ МАС НА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ Ў ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ, на выкананьне пастановы пленуму гаркому КП(б)Б аб ахопе калектывізацыяй 60 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па прыгарадным раёне да пачатку сяўбы. Гарпрафсавет павінен забясьпечыць актыўную ролю пралетарыяту Менску ў сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі, у перадачы пепшага вопыту арганізацыі працы нашых прадпрыемстваў у калгасы і саўгасы. КОЖНЫ ВЫТВОРЧЫ КАЛЕКТЫЎ—ШЭФ ПАВІНЕН ТРЫМАЦЬ ЭКЗАМЭН НА ЛЕПШУЮ БАРАЦЬБУ ЗА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ Ў СПРАВЕ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Паляпшэньне культурна-бытавога абслугоўваньня членаў прафсаюзаў ёсьць таксама адна з адказьнейшых задач гарпрафсавету. У бліжэйшы час трэба дабіцца поўнага ажыцьцяўленьня пастановы V пленуму УсеЦСПС у галіне перабудовы культработы, перабудовы страхкас і касузяемадапамогі.

У пленум УсеЦСПС зусім правільна перанёс увесь цяжар работы прафарганізацый на прыцягненьне членскай масы для практычнага ўдзелу на добраахвотных пачатках у прафрабоце, за кошт скарачэньня ліку платных работнікаў. Новаабраны гарпрафсавет павінен адразу прыцягнуць да практычнай работы лепшых ударнікаў-добраахвотнікаў.

Няма сумненьня, што першая гарадзкая канфэрэнцыя прафсаюзаў і новы гарпрафсавет, куды пралетарыят Менску пашле сваіх лепшых ударнікаў, на аснове генэральнай лініі партыі, на аснове хуткай і поўнай рэалізацыі рабочай ініцыятывы, якая накіравана на посьпяховае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва, на аснове шырока разгорнутай пралетарскай самакрытыкі—дабіцца ДАЛЕЙШАГА ПАВАРОТУ ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ І ПЕРАБУДОВЫ Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З ГЭТЫМ ФОРМ І МЭТАДАЎ ІХ РАБОТЫ.

ШУЛЬКІН.

Работнікі навукі і тэхнікі,—да актыўнай і самаахвярнай работы ў радох рабочай клясы пад кіраўніцтвам ленінскай партыі да поўнай перамогі камунізму

ПРАМОВА тав. МОЛАТАВА

на першай Усесаюзнай канфэрэнцыі па плянаваньні навукова-дасьледчай работы 11 красавіка 1931 г.

Таварышы, дазвольце вітаць вас і ў асобе канфэрэнцыі вітаць усю масу навукова-дасьледчых работнікаў ад імя Савету Народных Камісараў Саюзу і Цэнтральнага Камітэту бальшавіцкай партыі (бурныя апляўдысмэнты).

СКЛІКАНЬНЕ КАНФЭРЭНЦЫІ — ВЫРАЗ РОСТУ ГРАМАДЗКАСЬЦІ Ў НАВУКОВА - ДАСЬЛЕДЧАЙ ГАЛІНЕ

Мне прыходзіцца выступаць у канцы канфэрэнцыі, што палягчае магчымасьць выказацца аб значэньні яе работ. Сам факт скліканьня першай канфэрэнцыі па плянаваньні навукова-дасьледчай работы ў СССР мае вялікае значэньне. Гэты факт адлюстроўвае шпаркі рост сацыялістычнага плянаваньня ў нашай краіне і ўзрастаючую ўвагу савецкай улады да гэтых задач. Скліканьне гэтай канфэрэнцыі зьяўляецца выразам росту грамадзкасьці ў навукова-дасьледчай галіне. Разьвіцьцё гэтай грамадзкасьці ў цеснай сувязі з усёй пралетарскай грамадзкасьцю, цяпер навіна ісьці паскораным тэмпам. Усесаюзная канфэрэнцыя на плянаваньні навукова-дасьледчай работы дае магчымасьць больш ясна паказаць размах і пэрспэктывы навукова-тэхнічнай работы ў Савецкім Саюзе. На базе сацыялістычнага будаўніцтва і разам с яго шпаркім уздымам адкрываюцца выключна спрыяючыя магчымасьці для разьвіцьця навукі і тэхнікі, для росту навукова-тэхнічных кадраў, для ўздыму ўсёй культуры народаў СССР.

ЗАДАЧА АЎЛАДАНЬНЯ ТЭХНІКАЙ — ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА МОМАНТУ

Асабліва значэньне гэтай канфэрэнцыі заключаецца ў тым, што з пункту гледжаньня будаўніцтва сацыялізму яна сабралася ў выключна важны момант. Даволі напомніць аб тым, што 1931 год зьяўляецца рашаючым годам для ажыцьцяўленьня пяцігодкі народнай гаспадкі ў паскоранымі тэрміны, у працягу 4-3 год. Пя гледзячы на наяўныя труднасьці, мы пас пяхова ажыцьцяўлем пяцігодку. Пяцігодка ажыцьцяўляецца ў больш кароткія тэрміны, чым было першапачаткова намочана. На некаторых гаспадарчых вучастках пяцігодка ўжо ажыцьцёўлена. Прыклады нафтавай прамысловасьці Баку і Грознага, а таксама электрапрамысловасьці, пакуль у асобе «Электразавода» ў Маскве, «Красной зари» і «Светланы» ў Ленінградзе сьведчаць аб пераможным выкананьні пяцігодкі. У гэтых галінах прамысловасьці мы дасягнулі ўзроўню канца пяцігодкі не за пяць год, а за два з палоўкай гады, г. зн., усяго за палову пягігадовага тэрміну. Посьпехі пяцігодкі далі нам магчымасьць паставіць у 1931 г. задачу завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў СССР.

На аснове гэтых посьпехаў савецкай уладай высунуты грандыёзныя задачы на бліжэйшае дзесяцігодзьдзе. Вялізарны і ўсё больш паллічаны рост патрэбнасьцей мас у нашай краіне і нагроза, якая павісла з боку вьнешняга імпэрыялістычнага сьвету пад СССР з-за нашай адсталасьці параўнальна з капіталістычнымі краінамі, патрабуюць ад нас практычнага вырашэньня задач давяць і пераганяць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны ў найкарацейшы тэрмін у працягу дзесяцігодзьдзя з 1931-1940 году і нават раней скарачэньня гэтага тэрміну. Усё гэта па-новаму паставіла перад рабочай клясай задачу аўладаньня тэхнікай. Высунутая тав. Сталіным задача аўладаньня тэхнікай прызнана нашай партыяй цэнтральнай задачай моманту. Гэта знайшло належнае адлюстраваньне і ў пастановах нядаўна скананага VI зьезду саветаў.

З гэтага вынікае, што ў цяперашні момант пытаньне аб ролі навукова-тэхнічнай работы, аб значэньні справы стварэньня навукова-тэхнічных кадраў і ўмовах работы ўсёй масы навукова-тэхнічных работнікаў мае выключна важнае значэньне. Тым больш, што ў нас вельмі вялікі недахват навукова-тэхнічных сіл. Аднак, калі я гаварыў аб масе навукова-тэхнічных работнікаў, дык, зразумела, я выключаю з гэтай масы тыя элементы, якія замест цеснай работы ў радох савецкіх спэцыялістаў заняліся злачынай арганізацыяй контр - рэвалюцыйных шкодніцтваў у гаспадарчым апараце. Судовыя працэсы над шкоднікамі і іншыя выкрыцьці контр-рэвалюцыйнай работы шкодніцкіх груп у выстарчальнай меры паказалі неабходнасьць у цяперашніх умовах узмоцненай пільнасьці рабочае клясы ў адносінах да клясавых ворагаў, якія ня толькі ня складваюць сваёй зброі ў барацьбе з уладай саветаў, але ня спыняюцца ні перад якімі сродкамі барацьбы з ёю. Супроць гэтых зрадніцкаў рабочай клясы савецкая ўлада ўжывала і будзе ўжываць самыя рашучыя і бязьлітасныя меры. Зграі шкоднікаў, разам з іх кіраўнікамі пакшталт панаў Рамзіных, Громанаў і іншых, не зматі знайсьці якой-небудзь трывалай глебы ў масе навукова-тэхнічных работнікаў. У асобе, сваіх кіраўнікоў яны прыналі поўнае банкрутства сваіх спроб абаперці ся на інжынэрна-тэхнічнае асяродзьдзе, ня кажучы ўжо аб адсутнасьці ў іх якіх-небудзь сувязей з масай працоўных.

ПЛЯНЫ ІНТЭРВЭНТАЎ САРВАЛІСЯ

Аднак, мы ня будзем закрываць вачэй на тое, што разьлікі контр-рэвалюцыйных шкоднікаў, былі зьвязаны з фактам палітычных хістаньняў сярод інжынэрна-тэхнічных работнікаў, якія ўзмацніліся за апошнія 2-3 гады. Узмацненьне гэтых хістаньняў мёда месца ня толькі ў гэтым асяродзьдзі. Вядома, што і ў нашай партыі, нават сярод некаторай часткі бальшавікоў, у гэты перыяд былі значныя палітычныя хістаньні. Тым больш гэта трэба сказаць у адносінах пэўнай часткі спэцыялістаў і ў тым ліку нават у адносінах некаторых тэхнікаў, інжынэраў і навуковых работнікаў, якія ў папярэдні перыяд лёйльна працавалі ў нашым дзяржаўным апараце пад кіраўніцтвам бальшавікоў.

Для ацэнкі цяперашніх настроеў у асяродзьдзі навукова-тэхнічных работнікаў мае важнае значэньне тая акалічнасьць, што савецкая ўлада да гэтага часу ўжо ў асноўным вырашыла трудней шыя задачы рэвалюцыі, паўстаўшыя перад ёю на ўвесь рост іменна ў гэтыя апошнія 2-3 гады. У нас яшчэ далёка ня зжыты труднасьці барацьбы за перамогу сацыялізму, але ў разгорнутай за апошнія гады барацьбе паміж сацыялістычнымі і капіталістычнымі элементамі, асабліва ў вёсцы, сацыялізм у СССР ужо атрымаў рашаючую перамогу. Ленінам довадам гэтага зьяўляецца паварот асноўнай сялянскай масы на шлях калектывізацыі, па шлях сацыялізму. Гэты факт знайшоў ужо настолькі яркае аілюстраваньне ў разьвіцьці савецкай вёскі, што выкліканыя ў папярэдні перыяд трудняцьці барацьбы з кулацтвам, хістаньні ў асяродзьдзі навукова-тэхнічных работнікаў цяпер прыходзяць да канца. Вельмі ясна, нават для людзей, якія стаяць у баку ад актыўнай палітычнай барацьбы, што савецкая ўлада выйшла пераможцай у гэтай барацьбе з капіталістычнымі элементамі, у барацьбе за канчатковы паварот сярэдняка ў бок сацыялізму. З асаблівымі труднасьцямі будаўніцтва сацыялізму апошняга перыяду зьвязаны былі таксама разьлікі нашых вьнешніх ворагаў з лягеру імпэрыялізму. Вядома, што эміграцыі «сторонники» у Парыжы, на службе якога знаходзіліся паны Рамзіны, Ларычавы, Громаны і іншыя, меў задальне на контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай рабоце ўнутры СССР для зямежнай інтэрвэнцыі, якая падрыхтоўвалася ў 1930-31 годзе. Нашы ворагі ўнутры і па-за межамі Савецкага Саюзу разьлічвалі на крах пяцігодкі і на сілы супраціўленьня кулацтва. Іменна з гэтымі былі зьвязаны плыны інтэрвэнцыі на 1930-31 г. Цяпер ясна, што гэтыя плыны сарваліся. Паны інтэрвэнты ня спынілі сваёй падрыхтоўкі нападу, але вымушанае адтэрмінаваньне ў ажыцьцяўленьні іх плянаў мае выключнае значэньне для ўмацаваньня ня толькі ўнутраных, але і міжнародных пазыцый савецкай улады. Такім чынам, з гэтага боку зьвяртаюцца прычыны ўзмоцненых за апошнія гады хістаньняў у пэўнай частцы навукова-тэхнічных работнікаў.

ЗАДАЧА КАНФЭРЭНЦЫІ

Наша задача заключаецца ў тым, каб дапамагчы хутчэйшаму ажываньню гэтых хістаньняў. Савецкая ўлада ня імкнецца да таго, каб разьдзьмухваць або падкрэсьліваць факты палітычных хістаньняў, якія меліся ў апошні перыяд у пэўнай частцы спэцыялістаў. На адварот, яе задачай зьяўляецца забесьпячэньне максымальна актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве ўсёй масы інжынэрна-тэхнічных работнікаў і ў тым ліку тэй яе часткі, у якой меці месца палітычныя хістаньні яшчэ ў нядаўні перыяд. І ў гэтых адносінах вялая канфэрэнцыя можа мець вялікае станоўчае значэньне. Канфэрэнцыя павінна падбадзёрыць работнікаў навукі і тэхнікі і забясьпечыць узмацненьне іх актыўнасьці ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве. Чым лепш канфэрэнцыя выканае гэту задачу, тым большым будзе яе значэньне.

Што датычыць непасрэдна практычнай задачы, якая стаіць перад канфэрэнцыяй у галіне ўнясэньня плянаваньні ў справе навукова-дасьледчай работы краіны, дык на гэтым мне няма неабходнасьці спыняцца падрабязна, асабліва з прычыны таго, што канфэрэнцыя паказала адпаведнасьць ў вырашэньні асноўных практычных пытаньняў у гэтай галіне. Канфэрэнцыя паказала, што навукова-тэхнічныя работнікі прызнаюць і актыўна падтрымліваюць правядзеньне ў жыцьцё ідэі плянаваньня навукова-дасьледчай работы. Гэта думка навукова-тэхнічнай грамадзкасьці павінна знайсьці сваё аілюстраваньне ў адпаведных практычных вывадах з боку савецкіх органаў. Ня спыняючыся зараз на дэталях, можна толькі сказаць, што ў бліжэйшы час павінны быць праведзены пэўныя арганізацыйныя меры, якія спрыяюць далейшаму разьвіцьцю навукова-дасьледчай работы ў краіне пры забесьпячэньні поўнага адзінства пляну і ў гэтай галіне.

Аднак, ясна, што калі мы гаворым аб неабходнасьці плянаваньня ў навукова-дасьледчай рабоце ў цэлым, мы павінны ўнікнуць бюракратызацыі справы. Нельга, далей на спыніцца на ўмовах працы навукова-тэхнічных работнікаў. Умовы работы спэцыялістаў у СССР карэнным чынам адрозьніваюцца ад умоў работы адпаведных груп у капіталістычных дзяржавах. Рашаючая маса інжынэраў і навуковых работнікаў у капіталістычных дзяржавах працуе на капіталістаў, працуе для павялічэньня іх прыбытку. У нашай краіне навукова-тэхнічныя кадры працуюць непасрэдна для народу, для рабочай клясы, для працоўных мас гораду і вёскі. Цяпер, калі партыяй пастаўлена задача — бальшавікі павінны аўладаць тэхнікай, — мы павінны аддаць асабліву ўвагу ўмовам работы навуковых і тэхнічных работнікаў. Пры гэтым трэба мець на ўвазе як старых спэцыялістаў, так і маладыя кадры, як камуністаў, так і беспартыйных работнікаў навукі і тэхнікі.

ПАЛЯПШЭНЬНЕ ЎМОЎ РАБОТЫ НАВУКОВА - ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ МАЕ АКТУАЛЬНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ

Нельга ня прызнаць, што пытаньне аб паляпшэньні ўмоў работы навукова-тэхнічных работнікаў у цэнтры і асабліва на мясцох мае актуальнае значэньне ў цяперашні час. У гэтай сувязі, перш за ўсё, треба спыніцца на пытаньнях быту. Зараз ня прыходзіцца гаварыць аб асобных момантах у бытавой абстаноўцы работы нашых спэцыялістаў. Але нельга не закрануць узьнятага ў апошні час пытаньня аб ліквідацыі цэнтральнай камісіі па паляпшэньні быту вучоных — ТКГ. Спробы ліквідацыі гэтага органу, якія дзе-ні-дзе робяцца, нельга ня прызнаць памылковымі і нямэтазгодным. Зараз нельга гаварыць аб ліквідацыі такога органу, які аказваў і можа аказваць падтрыманьне, нехай памаленьку, няхай павялікае, але сапраўднае падтрыманьне ў справе паляпшэньня быту навукова-тэхнічных работнікаў. Справа ня ў тым, каб захаваць ТКГ у тым выглядзе, як яна існавала. Справа ў тым, каб існаваў орган, які меў-бы спэцыяльны нагляд і праўдзіў асаблівую ўважлівасьць да штодзенных патраб і ўмоў работы нашых навукова-тэхнічных работнікаў.

У нас наглядаецца рад непармальнасьцей і ў такой справе, як выданьне навуковых работ і выпуск неабходнай для навуковых і тэхнічных работнікаў замежнай літаратуры. Мы можам і павінны правесьці некаторыя меры на сапраўдным паляпшэньні гэтай справы ўжо ў бліжэйшы час.

РАЗЬВІЦЬЦЁ СЬМЕЛАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ — НЕАБХОДНА

Важнае значэньне мае таксама пытаньне аб умовах работы спэцыялістаў над кутом гледжаньня забесьпячэньня ўсямернага разьвіцьця навукова-тэхнічнай ініцыятывы. **Разьвіцьцё сьмелай ініцыятывы, значыцца, і дапушчэньне пэўнай рызыкі ў навукова-тэхнічнай рабоце, бязумоўна, неабходна.** Той, хто ня хоча адрозьніць злога ўмыслу шкоднікаў ад законнай у рабоце рызыкі навуковага і тэхнічнага прапаўніка, той ня толькі ставіць у ненармальныя ўмовы работу тэхніка і інжынэра, але і **наносіць простую страту інтарэсам савецкай улады.** Навукова-дасьледчыя інстытуты і паасобныя работнікі навукі і тэхнікі павінны сустрэць з боку савецкіх органаў усякае падтрыманьне ў справе паляпшэньня ўмоў для разьвіцьця сапраўднай і сьмелай ініцыятывы ў навукова тэхнічнай галіне.

Пручуючыся марксыцка-ленінскім мэтадам, мы, бальшавікі, імкнемся да забесьпячэньня пануючай ролі мэтаду і дыялектычнага матэрыялізму ва ўсіх галінах навукі. Гэты мэтад, як сапраўды навуковы мэтад, зьяўляецца лепшай зброяй аўладаньня нашымі ўзрастаючымі навукова-тэхнічнымі кадрамі ўсімі дасягненьнямі сусьветнай навукі і тэхнікі. Пасьлядоўная барацьба за панаваньне гэтага мэтаду на ўсіх галінах навукі адпавядае сапраўдным інтарэсам разьвіцьця самой навукі. Гэта барацьба азначае непрымірымасьць у адносінах ідэалістычных тэорый з усімі іх адкрытымі і прыхаванымі рэакцыйнымі дадаткамі. Толькі ў гэтай барацьбе можна выхаваць марксыцка-ленінскія кадры навукова-тэхнічных работнікаў.

Разам з тым, нельга спрачаць задачы гэтай барацьбы. З прычыны слабасьці наяўных марксыцка-ленінскіх навуковых кадраў патрэбен яшчэ доўгі перыяд для таго, каб забясьпечыць панаваньне мэтаду дыялектычнага матэрыялізму ў навуцы. Пры гэтым, марксыцка-ленінская крытыка памылак навукова-тэхнічных работнікаў павінна выходзіць з таго, каб ня толькі не адштурхоўваць, а ўсё больш заваёўваць на свой бок сапраўдных работнікаў навукі і тэхнікі.

Абавязкам марксыцка-ленінскіх навуковых кадраў зьяўляецца Усебаковая і ўпартая работа па ўяўленьні дасягненьняў сусьветнай навукі і тэхнікі, па пераапрацоўцы вялізарных результатаў навуковай работы буржуазных спэцыялістаў і скарыстаньне ўсяго гэтага для справы сацыялізму, так гэтаму вучыў нас Ленін. Сама палітыка савецкай улады выходзіць з пэўных навуковых асноў. У гэтым яе прынцыповае значэньне і перамагаючая сіла ў грамадзкім разьвіцьці.

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ, ДА ПОЎНАЙ ПЕРАМОГІ КАМУНІЗМУ

Нашы буйныя дасягненьні ў галіне будаўніцтва сацыялізму бясспрэчны. Ня гледзячы на вялізарныя труднасьці, зьвязаныя, з аднаго боку, з дробна-сялянскім характарам нашай краіны і, з другога, з існаваньнем першай пралетарскай дзяржавы ў акружэньні непрымірымых варожых ёй капіталістычных краін, Савецкі Саюз пераможна ўмацоўвае ўнутраную пазыцыі і пасьпяхова падымае ролю пралетарскай дзяржавы, як міжнароднага фактара. Гэтыя нашы посьпехі зьяўляюцца аб'ектыўным пацьвярджэньнем правільнасьці бальшавіцкай палітыкі, ажыцьцяўленьне якой азначае арыўнаваньне капіталістычнага сьвету эксплёатацыі і замены яго новым, сацыялістычным грамадзтвам. Гэтыя нашы посьпехі мы непарыўна зьвязваем з марксыцка-ленінскім мэтадам палітыкі нашай партыі. Савецкі Саюз прайшоў ужо немалы шлях і перамог на сваім шляху вялізарныя труднасьці.

Перад савецкай уладай стаяць цяпер яшчэ больш складаныя задачы, у вырашэньні якіх выключна важную ролю павінна адыграць навука і тэхніка. Упэўненасьць у правільнасьці нашай палітыкі натхняе нас бадзёрасьцю і непахіснасьцю ў правядзеньні пастаўленых перад савецкай уладай задач сусьветнага гістарычнага значэньня.

Усе работнікі навукі і тэхнікі павінны цьвёрда стаць на бок савецкай улады, якая будуе сацыялізм. Заклікаем жа работнікаў навукі і тэхнікі да актыўнай і самаадданай работы ў радох рабочае клясы пад кіраўніцтвам ленінскай партыі — для поўнай перамогі камунізму. (Бурныя апляўдысмэнты. Інтэрнацыянал).

Рабочыя гарбарні „Бальшавік" рапартуюць

гарадзкой канфэрэнцыі прафсаюзаў:

У выніку перанесьненьня цэнтру прафработы ў цэх датэрмінова выкаран прамфінплян, 89,6 проц. рабочых ахоплены ўдарніцтвам

На мітынгу рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу менскай чырвонасьцяжнай гарбарні «Бальшавік» 14 красавіка прыняты рапарт гарадзкой канфэрэнцыі прафсаюзаў. У рапарце рабочыя шлюць гарачае прывітаньне делегатам канфэрэнцыі.

— Мы ўпэўнены,—заяўляюць у рапарце рабочыя гарбарні «Бальшавік»,—што канфэрэнцыя, пад кіраўніцтва гаркому КП(б)Б справіцца з тымі нялікімі задачамі, якія пастаўлены ў парадак дня яе работы.

— У лютым месяцы мінулага году,—гаворыцца далей у рапарце,—мы перабудавалі сваю прафработу на заводзе, перанесьлі цэнтр работы ў цэх, да вытворчай брыгады. Гэтым забясьпечана мабілізацыя ўсіх рабочых на выкананьне прамфінпляну. У выніку датэрмінова перавыкаран прамфінплян ударнага кварталу. Таксама датэрмінова выкананы колькасныя і якасныя паказальнікі прамфінпляну першага кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі. 89,6 проц. рабочых заводу зьяўляюцца ўдарнікамі. Усяго на заводзе 59 ударных і 17 «сквозных» брыгад. За бальшавіцкія ўзоры работы ніраўзаны 392 ўдарнікі.

Аднак, побач з вялікімі посьпехамі, у нас ёсьць і рад недахопаў у рабоце. У нас ёсьць разрыў паміж узроўнем прадукцыйнасьці працы і ростам зарплаты. Плянавычыўся прагулы на яўважлівых прычынах. Усё яшчэ мала рабочых ахоплена вучобай па павышэньні сваіх тэхнічных ведаў.

З 20 кастрычніка па 1 красавіка мы правялі шырокі масавы агляд усёй прафработы на заводзе, пачынаючы з прафгрупы і канчаючы заўкомам. Увесь агляд мы правялі пад кутом мабілізацыі рабочых на ліквідацыю недахопаў, якія ў нас яшчэ ёсьць і праверкі выкананьня пастановы V пленуму УсеЦСПС.

Надаючы вялікае значэньне падрыхтоўчай рабоце да VII Усебеларускага канфэрэнцыі.

Сёньня, у 7 гадз. веч., у памяшк. клюбу харчавікоў (Інтэрнацыянальная вул.) адкрываецца

1-я ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПРАФСАЮЗАЎ

з наступным парадкам дня:

1) Чэрговыя задачы прафсаюзаў у адпаведнасьці з рашэньнямі V-га пленуму УсеЦСПС і задачы Менскага гарпрафсавету.

2) Вынікі выкананьня прамфінпляну 1-га кварталу 1931 г. і далейшыя задачы (Дакл. тав. Грысевіч).

3) Справаздача камітэту страхкасы (Эйдэльштэйн).

4) Выбары кіруючых органаў гарпрафсавету і страхкасы.

Рыдача мандатаў на канфэрэнцыю праводзіцца в 12 гадз. дня ў клюбе харчавікоў.

ЦК і ФЗМК павінны прадставіць сьпіскі выбраных сходамі делегатаў на канфэрэнцыю ў аргбюро (арг.-інстр. сэктар ЦСПСБ).

ФЗМК павінны атрымаць запрашальныя білеты на канфэрэнцыю ў прэзід. атрыманьня мандатаў.

(Сёньня ў 5 гадз. веч., у памяшканьні клюбу харчавікоў (малая вала) адкрываецца

) ПАСЯДЖЭНЬНЕ ФРАКЦЫІ (——

1-ай Менскай гарадзкой канфэрэнцыі прафсаюзаў

Спадарожная нарада ўсіх членаў фракцыі канфэрэнцыі абавязкова

Прыцёк у калгасы з кожным днём узмацняецца

МАСКВА, 14. Прыцёк у калгасы з кожным днём узмацняецца. У бягучым годзе за студзень упягнута ў калгасы 734,4 тыс. гаспадарак, за люты 1.520,8 тыс., за сакавік — 1.661,5 тыс. гаспадарак. За першую дэкаду красавіка ў калгасы ўступіла 637 тыс. гаспадарак. Усяго на 10 красавіка ў калгасах СССР аб'яднална 11.187.500 гаспадарак, г. зн. 45,1 проц. агульнай колькасьці бядняцка-серадняцкіх двароў. Намечана на вясну праграма калектывізацыі ў асноўным выканана. Адстаюць толькі Заходняя Сібір, Усходняя Сібір, Далёка-Усходні край і Арменія.

Перамога рэспубліканцаў на муніцыпальных выбарах у Гішпаніі

ПАРЫЖ, 13. Паводле вестак з Гішпаніі, у 44 гарадох — цэнтрах правінцыі — разьлічаны муніцыпальныя выбараў, паміма 4 гарадоў, у якіх перамаглі манархісты, і аднаго, у якім галасы разьдзяліліся пароўну, на ўсіх іншых гарадох выбары скончыліся перамогай рэспубліканцаў. У 39 цэнтрах, з якіх атрыманы лічбовыя даныя, выбрана 748 рэспубліканцаў і 435 манэрхістаў.

Лева-буржуазная француская прэса раіць гішпанскаму каралю Альфонсу «запакоўваць чамаданы». Няпоўныя вестаткі не даюць прадстаўленьня аб колькасьці галасоў, паданых за кампартыю. «Юманітэ» паведамляе, што на выбары гішпанская кампартыя ішла з праграмай супроць манархіі і буржуазнай рэспублікі, за рабоча-сялянскую савецкую Гішпанію; экспропрыяцыя зямель буйных землеўласьнікаў і перадача гэтых зямель сялянам; зьнішчэньне гішпанскіх і др. сялянскіх даўгоў; стварэньне сялянскіх камітэтаў барацьбы; павышэньне зарплаты, скарачэньне працоўнага дня, страхаваньне рабочых, прызнаньне СССР і г. д.

Падрыхтоўка да 1-га мая за межамі

Напад паліцыі на рабочы сход, прысьвечаны першамайскай кампаніі

ВЕНА. Як паведамляюць з Сафіі, балгарская рабочая партыя адначасова праводзіць падрыхтоўку да 1-га мая і да надыходзячых парламэнцкіх выбараў. Цэнтральны камітэт рабочай партыі выпусьціў адозву да працоўных, у якой заклікае іх уносіць грошы ў першамайскі і прадвыбарчы фонды. Збор сродкаў пачаўся ўжо.

У Шумэні адбыўся сход рабочай партыі, прысьвечаны першамайскай і прадвыбарчай кампаніі, а таксама пытаньню аб барацьбе з фашызмам. Паліцыя заняла памяшканьне, у якім адбываўся сход і выслала назад у вёску ўсіх сялян, якія зьявіліся на сход. Увечары на вуліцах гораду адбылася дэманстрацыя каля 300 рабочых і сялян. Паліцыя напала на дэманстрантаў. Удзельнікі дэманстрацыі стралі будаваць барыкады з дзеравяных сярэдзін, лавак і г. д. Паліцыя адкрыла агонь па натоўпу і разагнала дэманстрантаў. Шмат рабочых арыштавана.

Рэвалюцыйныя прафсаюзы Францыі—на 1-га Мая

ПАРЫЖ. Унітарныя (рэвалюцыйныя) прафсаюзы Францыі ведуць дзейную падрыхтоўку да правядзеньня 1-га мая. Гэта работа перапляцаецца з падрыхтоўкай да надыходзячай агульнафранцускай канфэрэнцыі за адзінства прафруху. 20-е раённае аб'яднаньне прафсаюзаў (Парыскага раёну) склікае 19-га красавіка спэцыяльную канфэрэнцыю, дзе будуць абгаворваны гэтыя два пытаньні.

Польскі фашызм імкнецца

затапіць у крыві нацыянальна-вызваленчы рух працоўных мас Зах. Беларусі

ПРАТЭСТ МІЛЬЕНАЎ

На крывавую расправу польскага фашызму над нашымі братамі—адказваем 100 проц. уступленьнем у рады МОПР'у

Заслухаўшы інфармацыю аб крывавым тэроры фашысцкіх катаў на акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіне РАБОЧЫЯ І СЛУЖАЧЫЯ РЫМАРНАСЯДЗЕЛЬНАЙ ФАБРЫКІ рашуча пратэстуюць супроць катаваньняў і забойстваў разьюшанай паліцэйскай-ля

Партыйнае будаўніцтва

Больш клясавай пільнасьці
НА ФРОНЦЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ С.-Г.
Вострасьць бальшавіцкай самакрытыкі накіраваць на выкарчоўваньне элемэнтаў апартунізму ў рабоце

У барацьбе за сацыялістычную перабудову вёскі

Ёсьць зрухі

За апошнія два гады ў **Борквайцкім** раёне дасягнуты значныя посьпехі па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі і не спэцыялізацыі. Шляхам калгаснага і саўгаснага будаўніцтва выкарчоўваецца спадчына прынцыпаўпчыны, якая ў свой час у гэтым раёне мела пырокае практычнае адлюстраваньне.

Зараз аграмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі ў раёне складае 45 проц. зямельнай плошчы. У калгасах аб'яднана звыш 31 проц. бядняцка-сераднцкіх двароў.

Борквайцкі раён зьяўляецца адным з буйнейшых ільнаводчых раёнаў (плян загатовак—700 тон). Пасеўная плошча пад ільном у 1930 г. складала 3.571 гэкт., а ў гэтым годзе маркуецца засеець 7.264 гэкт., што дае павялічэньне на 103 проц. Ёсьць дасягненьні і ў разьвіцьці жывёлагадоўлі. Рост буйной рагатай жывёлы ў параўнаньні з мінулым годам вызначаецца на 26,5 проц., цялят —на 142 проц., авечак—на 40 проц. Разам з гэтым паншрасьцца кармавая база жывёлагадоўлі: павялічваецца засеў канюшны, коранплодаў, сілосаваньня кормоў і інш.

Ёсьць значны зрух у справе спэцыялізацыі калгасаў і арганізацыі новых савецкіх гаспадарак. Арганізован буйны ільнаводчы саўгас на плошчы 7 тысяч гэкт., які ўжо ў мінулым годзе засеў 436 гэкт. ільну, а ў гэтым годзе будзе засеяна ільном 1.200 гэкт. Праводзіцца спэцыялізацыя 24 калгасаў, як ільнаводчых і жывёлагадоўчых, пяць калгасаў ільнаводчых, тры птушкіныя. Будуецца завод па перапрацоўцы ільну, які ўжо ў бягучым годзе перапрацуе каля 10 тысяч тон ільну. Гэты завод будзе стымулаваць шырэйшае ільнаводзтва ў раёне.

Але трэба адзначыць, што ў справе спэцыялізацыі калгасаў няма адпаведнай выразнасьці і канкрэтнасьці кіраўніцтва з боку раённых органаў—РВК і райкалгассаюзу. У радзе калгасаў не пераможаны яшчэ імкненьні вёсьці спажывецкія гаспадаркі.

Падрыхтоўка да другой бальшавіцкай весны ў раёне сёлета праходзіць больш цяжка, больш арганізавана, чым у мінулым годзе. У асноўным даведзены кантрольныя лічбы на гаспадарак, праводзіцца апыстка насеньня, рамонт інвентару і інш. Галоўнае ў падрыхтоўцы да весьнавой сяўбы—гэта значнае пашырэньне калектывізацыі, што сьведчыць аб рашучым павароце бядняцка-сераднцкіх мас на шлях калектывізацыі.

Рэзультаты прыступленьня клясавай пільнасьці

Усе гэтыя мерапрыемствы па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і яе спэцыялізацыі, як ільнаводчай і жывёлагадоўчай, правядзеньне гаспадарча-палітычных кампаній патрабавалі максымальнай увагі і энэргіі з боку партыйнай арганізацыі і васковага актыву. Гэта вялізарнейшая работа праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, на ўмовах шалёнага супраціўленьня кулацтва ўсім мерапрыемствам партыі на вёсцы. Кулацкія элемэнты сваёй варожай агітацыяй, падпалямі і тэрорам імкнуцца сарваць калгаснае будаўніцтва. Разам з гэтым клясавы вораг, часамі выкарыстоўваючы прыступленьне клясавай пільнасьці, палітычную сьлепату пасасобных зьвеньняў партыйнай арганізацыі, пралезьны ў рады партыі і на кіруючыя пасады па пасасобных вучастках работы, падрывае работу па сацыялістычным будаўніцтве. Рад ліквідатарскіх скарыстоўвалі прабываньне ў радах партыі для таго, каб падрываць работу, каб дапамагаць клясаваму ворагу сваёй апартуністычнай дзейнасьцю, яўным сабатажаньнем дырэктыў партыі.

У часе правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній у некаторых зьвеньнях партарганізацыі былі дапушчаны грубыя скажэньні лініі партыі. **Нежаданьне наўсякаць на кулака і заможную частку вёскі, адсутнасьць работы з беднатой**, яўнае ігнараваньне беднаты—мелі месца ў **Борквайцкім, Галубоўскім, Кушнікоўскім і Дзяржвіцкім** сельсаветах. З другога боку, у радзе сельсаветаў **(Замшанскі, Прудзінкаўскі, Галубоўскі)** зьяўлялася перагібы ў адносінах да сераднцкіх і бядняцкіх гаспадарак.

Вось букет праваапартуністычных элемэнтаў і яўных кулакоў, якія пралезьлі ў партыю, вялі падрыўную работу супроць усіх мерапрыемстваў па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі. Сын былога буйнога арандатара—**Касач** пралез у партыю ў 1926 г. Ён яшчэ ў 1923 г. арганізаваў ілжэ-арцель з заможнікаў, у якую не дапушчаў прыёму батракоў і беднаты. Для таго, каб прыкрыць кулацкую дзейнасьць, Касач падтаварыў бедняка **Шавулу** быць старшынёй арцелі, але гэта трэба было Касачу да таго, часу, пакуль арцель была зацверджана ў раённых органах. Пасьля зацьвярджэньня арцелі гэтага бедняка выключылі. Арцель на працягу усяго свайго існаваньня эксплёатавала батракоў і беднату, даючы ім у пазыку хлеб і грошы на кабальных умовах. У мінулым годзе Касач быў перакінут у камуну **«Новая зара»**. Зьяўляючыся старшынёй камуны і адначасова сакратаром парт'ячэйкі, Касач давёў камуну да поўнага развалу. У калгасах **Галубоўскага** сельсавету, што кіраваліся ячэйкай на чале з Касачом, праводзілася да апошняга часу апартуністычная практыка. На чале калгасу **«Шлях сацыялізму»** стаў былы памешчык **Бараўцоў**. Калгас **«Юны мір»** быў засьмечан кулацкімі элемэнтамі, якія давялі гэту гаспадарку да распаду.

Старшынёй **Борквайцкага** сельсавету быў сын кулака **Капцюг**, які вызваляў ад цьвёрдых заданьняў кулакоў і займаўся **«очковтирательством»**, даючы ў РВК ніправільныя павялічаныя весткі аб загатоўках. Капцюг зараз выключан з партыі і аддадзены пад суд. Характэрны пахаджэньні кулака **Ільляшэвіч**. Для таго, каб пралезьці ў рады партыі, ён пасхаў у Мурманск, і, папрацаваўшы некалькі на вытворчасьці, дабіўся свайго. Адтуль вярнуўся ў Беларусь ужо з партыйным білетам і быў накіраваны ў Борквайцкі ільнаводчы саўгас у якасьці калёнважатага. У саўгасе ён арганізаваў кулацкую групу і быў актыўным натхніцелем антысэміцкіх выпадаў Апрача таго ён праводзіў яўнае шкодніцтва.

Камуну **«Новая культура»** давёў да заняпаду апартуніст **Клімовіч**, які, будучы старшынёй камуны, зацісканы ініцыятывы камунараў, ігнараваў беднату, меў цесную сувязь з кулакамі і аказваў ім падтрыманьне.

Гэты сьпіс яўных кулацкіх элемэнтаў, якія пралезьлі ў партыю в варожай мэтай, можна было-б павялічыць, але хопіць паданых фактаў, каб зрабіць паўныя вывады.

У Борквайцкай раённай партарганізацыі правы апартунізм пусьціў глыбокі карэньні, у радзе ячэек яўных апартуністаў, не праводзілася рашучая барацьба з праваапартуністычнай практыкай і «левымі» загібамі. Кіраўніцтва ячэек **Прудзінкаўскага, Борквайцкага, Замшанскага і Галубоўскага** сельсаветаў не мабілізавалі масы на барацьбу з кулацтвам, не жадалі накладаць на кулакоў цьвёрдыя заданьні па загатоўках, а дапускалі перагібы ў адносінах да сераднцкіх і бядняцкіх гаспадарак.

Нерашуча змагаюцца з апартунізмам

Мінулы склад раённага партыкіраўніцтва пакрываў правы апартунізм на практыцы, а цяперашні склад РК і райКК нерашуча ўзяўся за выкарчоўваньне апартуністычнай практыкі і за самаачыстку партыйных радоў ад чужых элемэнтаў. Рашэньні, якія не адбіваюць **не праводзіў выразнай клясавай лініі**, не праяўляў рашучасьці ў барацьбе з клясавым ворагам, аб чым сьведчаць факты змазваньня раду судовых спраў па фармальных матывах.

Паданыя факты гавораць аб тым, што, не гледзячы на праведзеную чыстку партыі, некаторыя ячэйкі Борквайцкай раённай партарганізацыі на працягу доўгага часу заставаліся засьмечанымі чужымі элемэнтамі. Знаходжаньне ў радах партыйнай арганізацыі былых вранграфтараў, яўных кулакоў, шырокае распаўсюджаньне праваапартуністычнай практыкі ў рабоце тлумачыцца тым, што ў Борквайцкай партарганізацыі самакрытыка разгорнута зусім слаба.

Для выкарчоўваньня апартуністычнай практыкі рабоце, самаачыстцы партыйных радоў ад клясава-варожых і ідэалёгічна няўстойлівых элемэнтаў, партарганізацыя Борквайцкага раёну павінна разгарнуць шырокую бальшавіцкую самакрытыку. Гэта неабходная ўмова для пасьпяховага выкананьня задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі.

В. Масэвіч.

Бюро ячэйкі Калгасцэнтру страціла бальшавіцкую пільнасьць

Брыгада, якая абсьледвала работу партыйнай **ячэйкі Калгасцэнтру** ў сувязі з падрыхтоўкай да перавыбораў ніжэйшых парторганаў, выявіла, што ячэйка далёка ня справілася з выкананьнем задач, якія партыя ўскладала на Калгасцэнтр у галіне практычнага кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам, невыстарчальна змагалася з правай практыкай, якая мела месца ў рабоце апарату.

Аб пануючасьці правай практыкі ў галіне падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы ў апараце Калгасцэнтру ў свой час сыгналізавалі газэты «Зьвязда» і «Правда». З часу зьявіцьцяньня матар'ялаў, якія в усёй відавочнасьцю падкрэсьлівалі наяўнасьць апартуністычных тэндэнцый у пасасобных зьвеньнях апарату, прайшло больш месяца, між тым бюро ячэйкі літаральна ня ўжыло ніякіх захадаў, каб мабілізаваць усю масу камуністаў і беспартыйных работнікаў па выкарчоўваньне правага апартунізму, па разгортваньне сапраўды бальшавіцкай падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі.

Аб тым, што бюро ячэйкі падаацэньвала палітычнага значэньня барацьбы з элемэнтамі правага апартунізму, сьведчыць той факт, што партыйная ячэйка прайшла міма кулацкага дакументу, які быў атрыманы Калгасцэнтрам ад старшыні Старадарожскага райкалгассаюзу. **Дакумант, у якім адбіваецца пэўная праграма кулацкіх дзеяньняў і каданьняў, праляжаў больш месяца ў сталах апарату і нават да гэтага часу не абгаворан ні ў партыйнай ячэйцы, ні работнікамі Калгасцэнтру.** Гэты факт сыгналізуе ад прыступленьні клясавай пільнасьці, аб непаваротлівасьці партыйнай ячэйкі Калгасцэнтру.

Характэрна, што праваапартуністычная **Варкунова** спэцыяліста ў запраектаваных плянах разьвіцьця жывёлагадоўлі не спаткала належнага адпору з боку бюро ячэйкі і з боку кіраўніка сэктару жывёлагадоўлі тав. **Самусевіча**, які прымірэнча адносіўся да палітычна-шкодных настроеў Варкунова. Устаноўкі Варкунова з усёй выразнасьцю адбівалі ў плянах жаданьне контр-рэвалюцыйнага кулацтва падарваць разьвіцьцё сацыялістычнага сэктару земляроблства. Бюро ячэйкі на гэтым дакумэнце павінна было мабілізаваць усю масу работнікаў апарату на бязьлітасную барацьбу з кулацкай праграмай, а правым апартунізмам, які знайшоў свой адбітак у плянах разьвіцьця жывёлагадоўлі. Але бюро ячэйкі чамусьці прайшло моўчкі міма шкодніцкай работы Варкунова, міма праваапартуністычнага дакументу.

Пытаньнем масавай работы ў калгасах, пытаньнем разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах,—апарат Калгасцэнтру зусім не займаўся. Калгасцэнтр і пасасобныя яго сэктары пягнуліся ў хвасьце палітычных падзей. Аб гэтым выразна гаворыць той факт, што такое важнае мерапрыемства, як кантрактацыя, аўладаньне тэхнікай ня былі абгаворваны ні на бюро, ні на сходзе ячэйкі.

Шкодніцкая работа, якая мела месца ў плянаваньні і ў будаўніцтве крухмальных заводаў, што будаваліся без эканамічнага ўгрунтаваньня і ў бязводных мясцох, таксама засталася па-за увагай ячэйкі. Пасьля выяўленьня шкодніцтва ячэйка нічога не зрабіла для выпраўленьня праектаў і плянаў, якія складаліся шкодникамі.

Прыведзеныя факты з усёй катэгарычнасьцю гавораць аб пануючасьці правай практыкі ў пасасобных зьвеньнях апарату Калгасцэнтру, але в гэтым не вадзяецца сакратар ячэйкі т. **Кіркас**, якая заявіла брыгадзе, што **калі ў апараце Калгасцэнтру і ёсьць шкодніцтва і апартунізм, дык з ім не ячэйка павінна змагацца, а вышэйшыя органы.**

Ячэйка ня выканала дырэктыў пленуму ЦК КП(б)Б на нацыянальным пытаньні, не зрабіла карэннага пералому ў справе беларусізацыі, абслугоўваньня нацыянальных меншасьцяй. У апараце быў рад момантаў прапяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму, актыўнага супраціўленьня ва ўжываньні белмовы. На гэтых фактах бюро ячэйкі не мабілізавала масы для бязьлітаснай барацьбы з ухілямі ад ленінскай нацыянальнасьці.

Усё гэта гаворыць аб пануючасьці раду вялізарных прарываў у рабоце партыйнай ячэйкі і апарату Калгасцэнтру. Бясспрэчна, што толькі рашучая барацьба з тэорыяй і практыкай правага апартунізму, разгортваньне шырокай самакрытыкі дасьць магчымасьць узьняць на належную вышыню работу апарату Калгасцэнтру, зробіць яго сапраўдным штабам практычнага кіраўніцтва рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі.

П.

Шкодны штамп

Мастацкі нарыс у друку і [illegible] мае вялізарнае [illegible] ненных узораў работы па пасобных участках сацыялістычнага будаўніцтва, у справе паказу сапраўдных герояў, калектываў на ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі.

Адбіваючы ў нарысе разгорнутае сацыялістычнае наступленьне, паказваючы ня рабочых або калгасных калектываў, пераманаючы труднасьці дамагаецца посьпехаў на тым ці іншым вучастку работы, у той-жа час нельга ігнараваць і абыходзіць моўчкі ўмоў, у якіх змагаецца калектыў, нельга ігнараваць труднасьцяй, абвостраных клясавай барацьбы, змаганьня калектыву з усякімі скажэньнямі генэральнай лініі партыі.

Нарыс можа быць каштоўным толькі пры ўмове паказу сапраўднасьці, глыбокага вывучэньня працэсаў клясавай барацьбы і разгорнутага яе паказу.

Невыкананьне гэтай умовы цягне за сабой адрыў ад канкрэтнай рэчаіснасьці, ад сапраўднай гэрокі сацыялістычнага будаўніцтва. Нарыс, які не адбівае і не паказвае клясавай барацьбы пераўтвараецца ў просты шкодны штамп.

Я. Шкадарэвіч ня выканаў гэтай умовы і таму нарыс «На ленінскім шляху» («Шляхі калектывізацыі» № 3) ператварыўся ў штамп апартуністычнай практыкі. Нарыс Шкадарэвіча цалкам прысьвечан посьпехам і становішчу калгасу імя XII зьезду КП(б)Б.

Нарыс пачынаецца з наступных традыцыйных, не аб чым, не гаворачых слоў:

«Там, дзе раней былі маёнткі... дзе жыў абшарнік...»

Чытач сам разумее, што можа быць «там, дзе раней...» і таму мы ня будзем прыводзіць цэлага традыцыйнага абзацу, з якога пачынаецца добрая палова такіх нарысаў, як нарыс Шкадарэвіча. Пярэдзем непасрэдна да сутнасьці справы, да рэчаіснасьці, у якой забываўся Шкадарэвіч.

Нам вядома, што Шкадарэвіч паведаў калгас імя XII зьезду КП(б)Б у пачатку лютага 1931 г., г. зн. якраз у той час, як у калгасе працавала спэцыяльная камісія Талачынскага райкому партыі, якая выкрыла рад вялізарных прарываў у рабоце калгасу як вынік праваапартуністычнай практыкі кіраўніцтва калгасу і партыйнай ячэйкі.

Калгас імя XII зьезду КП(б)Б быў арганізован каля 3-го году таму назад. За 3 гады ўпартага змаганьня на сацыялістычным шляху калгас стаў у рады першых на разьвіцьці свайёй гаспадаркі, на арганізацыі прыліву бядняцка-сераднцкіх гаспадарак. Досьць паказаць, што зараз у калгасе налічваецца больш як 330 батрацка-бядняцкіх і сераднцкіх гаспадарак, 8 трактараў, — каб пераканацца, што прайшоўшыя тры гады з часу арганізацыі калгасу былі гадамі буйнага росту сацыялістычнай гаспадаркі, гадамі ўпартай барацьбы з кулацтвам за замацаваньне і пашырэньне калгасу.

Нельга адмаўляць вялізарных посьпехаў калгасу як у пашырэньні пасеўнай плошчы, уздыме ўраджайнасьці, машынізацыі, так і ў правядзеньні гаспадарча - палітычных кампаній. Бясспрэчна, што калгас расьце, але бясспрэчна і тое, што часамі рост праходзіць вельмі хваравіта, што наперакор актыўнасьці і памаганьням асноўнай масы калгасьнікаў кулацкія элемэнты, якія пралезьлі ў калгас, разам з правымі апартуністамі тармозяць рост, вядуць калгас назад, шкодзяць у пасобных галінах гаспадаркі, ідавочна, што ў калгасе адбываецца прапас клясавай барацьбы.

Якраз гэтай клясавай барацьбы ў калгасе, барацьбы перадавога атраду калгасьнікаў з праваапартуністычнай практыкай не заўважыў гастраляр-нарысіст Шкадарэвіч. Выйшаў-б ліпшым падаваць вытрымкі з артыкулу-нарысу Шкадарэвіча, бо ў ім няма ні аднаго слова аб тым, у якіх умовах змагаласі і змагаецца асноўная маса калгасьнікаў, як няма і простага паказу сапраўднасьці.

Шкадарэвіч цалкам даверыўся старшыні праўлення калгасу апартуністу [illegible] ...ашным, ім бяз... згоды праўленьня прымаліся ў калгас і нават пасылаліся на курсы па падрыхтоўцы сьвінаводаў і г. д.).

Шкадарэвіч-Тарасевіч захапляецца посьпехамі будаўніцтва ў калгасе: «Шырокая разгорнута ў калгасе будаўніцтва. Пабудавана 10 дамоў, стайня, хлебны сарай...» і зусім ня цікавіцца якасьцю будаўніцтва, яго таннасьцю і рацыянальнасьцю.

Вось што па гэтым пытаньні запісана ў вывадах камісіі, якая абсьледвала калгас, у часе паведваньня яго Шкадарэвічам:

«Дрэнная якасьць будаўніцтва: новапабудаваная павець абваліваецца, абваліваецца страха ў сталоўцы і інш. Праўленьне калгасу не рэагавала на гэтыя зьявішчы і невыстарчальна кіравала будаўніцтвам. Атрыманы цэмэнт для будаўніцтва быў разбазаран — абменьваўся на падэшву, а склеп для хаваньня гародніны і прадуктаў застаўся без рамонту і зараз завален сьнегам і вадою».

Зусім нецярпімым шкодным зьяўленьнем штампаваньне Шкадарэвічам праваапартуністычнай практыкі праўленьня калгасу і партыйнай ячэйкі ў галіне фінансавага становішча гаспадаркі. Шкадарэвіч сьцвярдзіў гімн апартуністам, якія нібыта дабіліся вялізарнай даходнасьці калгасу і фактычна дапамагае шкодникам праводзіць контр-рэвалюцыйную работу на разбазарваньні крэдытаў і сродкаў калгасу.

«Калгас зараз перажывае цяжкае фінансавае становішча. Закрэдытаванасьць перад дзяржавай, дзякуючы таму, што кіраўніцтва калгасу ня лічылася з гаспадарчымі магчымасьцямі і брала крэдыты, дзе толькі ўдавалася, дасягае 152 тыс. руб. З гэтай сумы патрэбна заплаціць у 1931 годзе 42 тыс. рублёў».

Гэта Шкадарэвіча - гастраляра зусім ня цікавіць, яму ня цікава на што выдаткаваны дзяржаўныя крэдыты, як рацыянальна яны выкарыстаны і чаму калгас перажывае цяжкае фінансавае становішча.

Бюро Талачынскага райкому партыі канстатавала, што праўленьне калгасу, скаціўшыся ў апартуністычнае балота, ігнаравала актыўнасьць асноўнай масы калгасьнікаў, тармазіла разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, патурала клясава варожым элемэнтам у сувязі з чым:

«сарван плян камплектаваньня сьвіннога стада... На скончан абмалот і не разьмеркавана ураджай... Не перапрацован і ня здан дзяржаве лён... Злачынна скарыстоўваюцца кармы...»

Шкадарэвіч зусім моўчкі абышоў работу партыйнай ячэйкі, замаўчаў, што рад камуністаў раззлажыліся, патанулі ў балоце праваапартуністычнай практыкі, замаўчаў, што партыйная ячэйка ў радзе выпадкаў абсьпетурыла дапамагала кулацкім антысавецкім элемэнтам разбураць калгас.

Надзвычай характэрна, што Шкадарэвіч моўчкі абышоў пытаньне аб арганізацыі працы ў калгасе, **аб пераходзе на зьдзельшчыну.** Гэта ў той час, калі ў калгасе яшчэ ня зьмыты «пайковы гастроль».

Мы адначасова адзначаем, што і Талачынскі райком партыі ў сваіх пастановах ня даў выстарчальнай ацэнкі гэтым настроям.

Нарыс Шкадарэвіча з усёй сур'ёзнасьцю сігналізуе перад намі аб наўмыслным падыходзе да вывучэньня мясцовага матар'ялу аб ігнараваньні працэсаў клясавай барацьбы, труднасьцяй, у якіх змагаецца асноўная маса калгасьнікаў. Шкадарэвіч не паказаў сапраўднасьці толькі таму, што не прааналізаваў матар'ялу, ня вывучыў клясавых суадносін у калгасе, даверыўся апартуністу Тарасевічу, чым дапамог апартуністычнаму кіраўніцтву і клясава варожым элемэнтам змагацца з асноўнай масай калгасьнікаў ціхенькі не ініцыятыву і актыўнасьць і праводзіць падрыўную работу.

[illegible]

Ламайце бар'еры апартунізму

(Урокі Макееўшчыны)

Чаму асноўная маса сялян Макееўшчыны (Клімавіцкага раёну) стаяла ў баку ад калгасу?

Ідэялія «клясавага міру» панавала там. Кулакі мірна ўраслі ў сацыялізм. Такі малюнак прадстаўляўся «кіраўніком» мясцовай парт'ячэйкі, якія самі зрасьліся з кулаком, Сакратар парт'ячэйкі—**БАРШЧЭЎСКІ**, старшыня калгасу «Кастрычнік»—**ДРАЗДОЎ** жылі нават на кватэры ў кулака Асмалоўскага, які быў іх бліжэйшым дарадчыкам па ўсіх пытаньнях калгаснага будаўніцтва. І ня дзіва, што ў калгасе «КАСТРЫЧНІК»—5,5 проц. КУЛАКОЎ.

Кулак уступаў для таго, каб разваліць калгас, каб скампрамэтаваць яго ў вачох сялянскай масы. Калгас «Кастрычнік» быў аплецены сеткай шкодніцтва. Калгас чахнуў і разбураўся пад кіраўніцтвам кулацкіх агентаў—Баршчэўскага і Драздова, па дырэктывах кулака Асмалоўскага. І таму каровы ў калгасе «Кастрычнік» галодныя, таму каровы дохнуць, дохлі цяляты, здохла больш паўсотні парасят і г. д. Таму ў калгасе былыя бетракі па сутнасьці такі і далей батрачылі як і раней і знаходзіліся ў надзвычай цяжкіх умовах.

Фонам для гэтых праваапартуністычных кулацкіх спраў зьяўлялася сыстэмна заціску самакрытыкі, прасьледваньня актывістаў сельскораў. Кулацкі агент з п[illegible] Баршчэўскі пагражаў на [illegible] сельскору-партыйцу [illegible] Марчанку [illegible] з партыі за выкрыцьцё [illegible] (Кулак Асмалоўскага, [illegible]).

РКК, якія па заявах калгасьнікаў і адпасобнікаў Макееўшчыны расьсьледвалі гэтыя справы. Кулацкі агент Баршчэўскі быў выключан з партыі.

Ужо пасьля гэтай пастановы клімавіцкіх партыйных органаў у Макееўчах засядала выязная партпройка ЦКК КП(б)Б, куды падаў апэляцыю Баршчэўскі. Зразумела, што парткройка ЦКК пацьвердзіла выключэньне Баршчэўскага з партыі і даручыла прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці ўсіх асоб, вінаватых у скрыўленьні клясавай лініі і злоўжываньнях.

І ПАСЬЛЯ ІНФАРМАЦЫІ АБ ПАСТАНОВЕ ТРОЙКІ НА СХОДЗЕ КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ НАЎКОЛЬНЫХ ВЁСАК 100 СЯЛЯН ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў КАЛГАС. Праваапартуністычная практыка была тым бар'ерам, які затрымліваў асноўную масу сялянства ад уступленьня ў калгас. Ударам па ёй гэты бар'ер быў зламаны. Беднякі і сераднякі Макееўшчыны рашуча сталі ўсёй масай на шлях калгаснага будаўніцтва.

Пытаньне «за ці супроць калгасу» стаіць перад кожным бедняком і сераднякам—адназасобнікам. Урокі Макееўшчыны гаворыць аб тым, што толькі ўзмацніўшы барацьбу з праваапартуністычнай тэорыяй і практыкай, толькі выгнаўшы з партыі агентаў кулака, толькі [illegible] ...ўшы іх супрацьлегласьць [illegible] пасорным [illegible] ...ны расамі [illegible] ...ны [illegible] ...ны [illegible] ...ны

Армейскія бальшавікі на сваіх партыйных канфэрэнцыях

вырашаюць пытаньні ўмацаваньня баяздольнасьці Чырвонай арміі на аснове генэральнай лініі партыі

Бальшавіцкае прывітаньне партыйным канфэрэнцыям Беларускай стралковай і Самарскай кавалерыйскай дывізій

АДКРЫЛАСЯ

18-я дывпартканфэрэнцыя Самарскай кавалерыйскай ударнай дывізіі

12 красавіка г. г. у 9 гадзін раніцы адкрылася 18-я дывізійная партыйная канфэрэнцыя №-ай Самарскай ударнай кавалерыйскай дывізіі імя ангельскага пралетарыяту.

Канфэрэнцыя вызначыла наступны парадак дня:

Даклад Цэнтральнага Камітэту камуністычнай партыі Беларусі,

Даклад паліткіраўніцтва ВВА,

Даклад камандаваньня і палітаддзелу дывізіі і справаздача дывпарткамісіі.

Першыя два даклады будуць абгаворваны сумесна з партканфэрэнцыяй стралковай беларускай чырвонасьцяжнай дывізіі.

У газаровы прэзыдыум канфэрэнцыі выбраны палітбюро ЦК УсеКП(б) і начскай кав. дывізіі, камуністычнай партыі Англіі, цэнтральнаму органу — «Красная Звезда» і Чырвонаармейскай Праўдзе».

Канфэрэнцыю адкрыў начальнік палітычнага аддзелу дывізіі—тав. Таруцінскі.

На канфэрэнцыю прыбыў для ўдзелу ў яе работах начальнік палітупраўленьня і член РВС ВВА—тав. Аранштам.

Гр. Шыфрын.

Дэлегаты канфэрэнцыі

Самарская кавалерыйская да 18 партканфэрэнцыі

Партыйная арганізацыя дывізіі прыйшла да канфэрэнцыі згуртаванымі радамі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, з апартунізмам усіх масьцей і правым ухілам у першую чаргу.

Партарганізацыя і камсамол значна вырасьлі: за справаздачны пэрыяд у цэнт нарыміцтва 442 чал. у камсамолу дывізіі на 45-50 проц., партарганізацыя дабілася ў выхаваньні байцоў і камандзіраў цьвёрдага разуменьня генэральнай лініі партыі і актыўнага падтрыманьня, удзел у сацыялістычным будаўніцтве. Пазыка «Пяцігодка—за чатыры гады», падпіска на пазыку трэцяга рашаючага году пяцігодкі, збор на дырыжабль «Клім Варашылаў», набор у вайсковыя школы, рост калгаснікаў — усё гаворыць аб моцным, устойлівым, палітычным стане дывізіі. У практычнай рабоце ёсьць таксама нямала дасягненьняў.

У цяперашні момант перад партарганізацыяй дывізіі стаяць задачы:

1. Закончыць зьверху данізу перабудову кіраўніцтва партработай, у першую чаргу пізавога эскадроннага зьвяна. Гэты паказ ня можа абмяжоўвацца толькі палітведамі, інструктажам групаводаў. Ён павінен ужочыць паказ у арганізацыйнай масавай рабоце ленпункта, партбюро ячэек УсеКП(б) і камсамолу і г. д. Ён павінен быць у казарме і асабліва ў полі на тактычных занятках. Кіраваць, вучыць, умацоўваць пізавое зьвяно партпалітработы (эскадрон, батарэя) і галоўным чынам паказам — у гэтым зараз асноўнае ў кіраўніцтве работай.

2. Яшчэ большае ідэалёгічнае згуртаваньне партарганізацыі вакол генэральнай лініі партыі. Барацьба самая рашучая з правым ухілам—галоўнай небясьпекай, якая ёсьць яшчэ ў дывізійнай арганізацыі, а таксама з тылі «лявацкімі» загібамі, якія выявіліся ў сувязі з прапрацоўкай VI зьезду саветаў (забарона прыёму ў партыю сялян аднаасобнікаў, залішнае ўдзяленьне да кулакоў усіх аднаасобнікаў).

3. Палепшыць якасьць работы вакол бая — падрыхтоўкі і ў першую чаргу камандзірскай вучобы. Канкрэтна гэта значыць забясьпечыць посьпех заняткаў камскладу шляхам найпрыйшай грамадзькасьці, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, давядзеньня «ліняў да камандзіраў», забясьпеченьня абстаноўкі для падрыхтоўкі заняткаў.

8 чырвонаармейцамі — адпліфаваць практычныя формы масавай работы, якія-б дапамагалі байцу сапраўды ясна ўявіць тую задачу, кантрольную лічбу, якая пастаўлена перад ім на ступень, дакаду, (а ня толькі перад яго эскадронам). Выкананьню канкрэтных задач па кожнай дысцыпліне чырвонаармейцам на ступень, дакаду, павінна быць падпарадкавана сацспаборніцтва, ударніцтва і вышэйшыя формы іх (сустрэчны план усебаразіцыя і г. д.).

Асабліва ўзьняць якасьць палітзаняткаў, вядучы рашучую барацьбу са скажэньнямі, якія наглядаюцца, клясавага зьместу іх, спрашчэньцтвам, неарганізаным адпору кулацкім выступленьням па іх.

Партыйная арганізацыя Самарскай дывізіі, меўшая за мінулы пэрыяд рад буйных дасягненьняў, здолее справіцца і з тымі задачамі, якія ўскладаюцца на яе ў цяперашні час.

Начпадыў ТАРУЦІНСКІ.

У падарунак 18 дывпартканфэрэнцыі

Часьці №-ай Самарскай кавалерыйскай дывізіі, пад кіраўніцтвам сваіх партыйных арганізацый, правялі вялікую работу па падрыхтоўцы да 18-ай дывізійнай партыйнай канфэрэнцыі. Праведзена шырокая растлумачальная работа сярод байцоў і камандзіраў аб задачах, стаячых перад дывпартканфэрэнцыяй. Створаны ўдарныя брыгады, штурмавыя калёны імя канфэрэнцыі з мэтай павышэньня якасьці баявой падрыхтоўкі, ліквідацыі прарываў, што маюцца і паляпшэньня якасьці падрыхтоўкі начскладу. Прароблена вялікая работа па падрыхтоўцы да перадачы ў партыю і камсамол лепшых байцоў-ударнікаў, рабочых і калгаснікаў. У №-кі кампартдыв падана 27 заяў з боку курсантаў аб прыёме ва УсеКП(б). Шырокае разгортваньне кампаніі па вярбоўцы ў калгасы дало рост калгаснікаў. У № астраханскім кавал. палку—100 заяў аб уступленьні ў калгасы. Уся работа вядзецца пад лёзунгам «Даць 18-ай дывпартканфэрэнцыі высокія якасныя паказальнікі па баявой і палітычнай падрыхтоўцы байцоў і камандзіраў».

Уся масавая работа ў ленкутках і ў клюбе накіравана на асьвятленьне посьпехаў, дасягнутых часьцямі, на найлепшае адлюстраваньне і давядзеньне да байца ходу і вынікаў канфэрэнцыі.

Палітаддзелам дывізіі прароблена вялікая работа па праверцы стану часьцей і практычнай дапамозе ў справе наладжваньня партпалітасьветработы. Гэта праверка выявіла, што ўдарная дывізія падыходзіць з вялікімі дасягненьнямі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы да сваёй 18-ай дывізійнай партканфэрэнцыі.

100 камсамольцаў— на рыбную лоўлю

ЦК ЛКСМБ АДЗНАЧЫЎ, ШТО РАЙКОМЫ ЛКСМБ НЕ АДДАВАЛІ НІЯКАЙ УВАГІ ВЫКАНАНЬНЮ ПЛЯНАЎ РЫБНАЙ ЛОЎЛІ Ў 1-м КВАРТАЛЕ, НІЧОГА НЕ ЗРАБІЛІ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЕСНАВОЙ ПУЦІНЫ. У РЫБАЦКІХ АРЦЕЛЯХ ЗУСІМ СЛАБАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ ПРАСЛОЙКА — ТОЛЬКІ РЫБАКОЎ ТОЛЬКІ 11 ЧЛЕНАЎ.

ЦК ЛКСМБ ПАСТАНАВІЎ НАКІРАВАЦЬ 100 КАМСАМОЛЬЦАЎ ДЛЯ РАБОТЫ Ў РЫБАЦКІЯ АРЦЕЛІ. РАЙКОМАМ І ЯЧЭЙКАМ ЛКСМБ ПРАПАНАВАНА АКАЗАЦЬ ДАПАМОГУ РЫБАЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ Ў ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЧЫСТКІ АРЦЕЛЯЎ АД КЛЯСАВА-ВАРОЖЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ.

Рабочае шэфства ажыцьцяўляецца на справе

Рабочыя заводу імя Варашылава ў парадку сацыялістычнага сумяшчэньня кіруюць работай сэктароў НКФ

Задачы поўнага выкананьня фінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуюць перабудовы форм і мэтадаў работы фінансавага апарату, наближэньня яго да працоўных, штодзённага рабочага кантролю і дапамогі ў паляпшэньні работы апарату. Лепшай формай масавага рабочага кантролю зьяўляецца рабочае шэфства.

Шэф Наркамфіну — завод імя Варашылава — выпучыў шэфскія брыгады, якія ў выходны дзень і ў вольны ад вытворчасьці час будуць практычна працаваць у адпаведных сэктарох НКФ.

Ажыцьцяўляючы рабочае шэфства, калектыў заводу імя Варашылава выпучыў нам. загадчыкаў сэктароў НКФ, якія, у парадку сацыялістычнага сумяшчэньня, будуць выконваць абавязкі па кіраўніцтве работай сэктароў.

НКФ БССР тав. ХАЦКЕВІЧ у спэцыяльным загадзе прапанаваў усім работнікам НКФ стварыць найбольш спрыяючыя ўмовы для работы шэфскіх брыгад.

Рабочыя кацэльнага цэху тав. ТАМАРОВІЧ назначан нам. загадчыка сэктару даходаў рабочы піцейнага цэху тав. РАЎБІЦЧ назначаны нам. загадчыка сэктару абагуленьня гаспадэркі, рабочы сьлясарна - зборачнага цэху тав. ЦОФІН — на пасаду нам. кіраўніка завода - плянавага сэктару, рабочы мэханічнага цэху МАРЦЮШЭНКА — нам. заг. сацыяльна-культурнага сэктару і рабочы інструментальнага цэху тав. ФАЙШТЭЙН назначан на пасаду нам. заг. арганізацыйна - інструктарскага сэктару.

МЕНСК

Да складаньня генэральнага пляну электрыфікацыі БССР

Эканамічная нарада БССР пастанавіла арганізаваць пры Дзяржпляне КАМІСІЮ САДЗЕЙНАСЬЦІ СКЛАДАНЬНЮ ГЕНЭРАЛЬНАГА ПЛЯНУ ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ БССР. У склад камісіі ўвайшлі т. т. ГОЛЬДБЭРГ (старшыня Дзяржпляну БССР, — ён-жа старшыня камісіі), ЧУДНОЎСКІ і ТОКАР (Дзяржплян), ДВАРЭЦКІ і ПАКЕЛІЦ (ВСНГ), МЕЛАМЭД (ВЭО), СЛОНІМ (інстытут прамысловасьці), МАРГОЛІН (Эльвод) і ПРАДСТАЎНІКІ МЫТ.

ЭКАНА прапанавала ўсім гаспадарчым і навуковым арганізацыям і ўстановам прыняць актыўны ўдзел у рабоце камісіі, тэрмінова выконваючы яе заданьні.

Назначэньне

Прэзыдыум ЦВК БССР назначыў тав. Фэльдмана, Язэпа Маркавіча, намесьнікам народнага камісара фінансаў БССР, пакінуўшы яго кіраўніком беларускай канторы Дзяржбанку.

Узмацніць рэалізацыю білетаў Азет-лётарэі

30-та мая адбудзецца тыраж 3-й усесаюзнай АЗЕТ-лётарэі. Ня гледзячы на тое, што да тыражу засталося ўсяго 1½ месяца, па БССР рэалізацыя лётарэйных білетаў праходзіць вельмі марудна, а ў некаторых раёнах амаль зусім і не распачалася. Так, па Віцебскім, Аршанскім, Барысаўскім, Горэцкім, Рагачоўскім раёнах да гэтага часу не рэалізован ні адзін білет. Па Мазырскім раёне рэалізавана білетаў на 200 руб., Полацкім—на 210 руб., Гомельскім—на 1.200 руб., па Менску—на 5.000 руб. і г. д.

Трэба неадкладна ўмацніць работу па распаўсюджаньні лётарэйных білетаў АЗЕТ'у. АЗЕТ-арганізацыі БССР павінны разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод рабочых і працоўных мас. БССР павінна поўнасьцю выканаць вызначанае заданьне.

Аздаравіць Менскую дзіцячую клініку

Безгаспадарчасьць і галавацяпства панае ў Менскай дзіцячай клініцы. Догляд і адносіны абслугоўваючага персаналу да хворых дрэнныя.

Нядаўна ў клініку прывезьлі некалькі дзяцей хворых менінгітам (запаленьнем мазгавой абалонкі). Аднак, галоўнага лячэньня — антымэнінгітавай сываратки няма. Дактары выдаюць бацькам хворых дзяцей рацэпты і тыя бегаюць па горадзе, шукаючы сываратку. Між тым сываратка ў дастатковай колькасьці ёсьць у Пастэраўскім інстытуце. РСІ павінна правесьці работу дзіцячай клініцы.

Нарада па мясцовай прамысловасьці

На 18-га красавіка ВСНГ склікае нараду мясцовай прамысловасьці.

На нарадзе будуць заслуханы справаздачы з месц аб ходзе падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону, аб складаньні плянаў і аб становішчы вучоту і справаздачасьці.

У нарадзе прымаюць удзел дырэктары і галоўныя бухгальтары найбольш буйных трэстаў і камбінатаў мясцовай прамысловасьці, таксама прадстаўнікі Дзяржпляну, НКФ, НК РСІ і інш.—разам каля 50 асоб.

Другарадныя віды загатовак --забыты вучастак

Нашы загатоўчыя арганізацыі—Белсалсаюз і Белкаапсаюз мала ўвагі аддаюць загатоўкам такіх другарадных відаў сырцу, як грыбы, брусьніцы, журавіны, чорныя ягады, рабіна. У апараце загатоўчых арганізацый няма асоб, якія-б займаліся загатоўкамі другарадных відаў, не падрыхтоўваюцца адпаведныя кадры.

Вось, напрыклад, хутка пачнуцца загатоўкі смарчкоў,—самых раньніх грыбоў—каштоўнага экспартнага тавару. Пакуль што ніхто не падрыхтоўваецца да збору смарчкоў, не прыцягнуты камсамольцы і піянэрскія арганізацыі.

Белкаапсаюз павінен паклапаціцца аб гэтай справе.

Прарывы на Ельскім вучастку

НАРОЎЛЯ. (Наш кар.). Ход загатовак лесу на Ельскім вучлеспрамгасе прымушае біць трывогу. Мы маем там поўны зрыў загатоўчых плянаў.

Плян загатовак лесаматар'ялаў выкапан на 1-га красавіка на 74 проц., ірэў—на 22,4 проц. Заданьне па вывазцы будаўнічых матар'ялаў выкапана на 41,6 проц., на дрывах—на 55,5 проц.

П. Чыкун.

Перад сплавам

Вывазку лесу—на брыгадныя мэтады працы!

Не пакінуць у лесе ні воднага бярвяна. Вывезьці ўсе матар'ялы да сплаўных прыстаняй

Зьлёты ўдарнікаў лесарубаў

Пад знакам перавыкананьня плянаў загатовак лесу

Паводле пастановы прэзыдыуму Беларускага камітэту саюзу лесарэўработнікаў, з 15 па 31-га красавіка па ўсіх леспрамгасах будуць праведзены зьлёты ўдарнікаў-лесарубаў.

На зьлётах будуць абгаворваны два важныя пытаньні: вынікі выкананьня прамфінпляну за першы квартал і плян летніх загатовак; даклады лесрабачкомаў аб праробленай працы, вынікі сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Зьлёты ўдарнікаў павінны са ўсёй рашучасьцю выкрыць недахопы ў рабоце гаспадарчых і сакавых арганізацый і вызначыць канкрэтныя меры для іх выпраўленьня.

Літбы ходу лесазагатовак гаворяць аб тым, што прамфінпляны ня выканаў амаль усімі леспрамгасамі, за выключэньнем Віцебскага. Яны сьведчаць аб радзе грубейшых памылак у рабоце леспрамгасаў.

ПАЛЕПШЫЦЬ ВЯРБОЎКУ РАБСІЛЫ

Трэба будзе абгаварыць пытаньне аб паляпшэньні сыстэмы вярбоўкі рабсілы. Практыка паказала, што апарат Наркампрацы з гэтай работай ня справіўся. Зараз, калі вярбоўка перададзена жасазагатоўчым арганізацыям, трэба ўвесьці плянавасьць у гэту работу, вылучыць у якасьці вярбоўчыкаў лепшых лесарубаў-ударнікаў, якія добра ведаюць вёску і могуць гаварыць з масамі.

Трэба рашуча ажыць такія выявішчы, якія мы мелі па асобных раёнах (Лагойскі, Пухавіцкі, Чэрвенскі), калі вёскі на 7-8 рас прымацоўваліся то да арганізацый, якія загатоўвалі камень, то да лесазагатоўчых арганізацый. У выніку такой блытаніны некаторыя вёскі ніводы ня сьцялілі і ня вывозілі ні каменю, ні лесу (Шыбакоі сельсавет).

Зьлёт павінен рашуча патрабаваць, каб мясцовыя арганізацыі дабіліся поўнага выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнай часткай.

СТВАРЫЦЬ ПАСТАЯННЫЯ КАДРЫ РАБОЧЫХ - ЛЕСАРУБАЎ

Вялікае значэньне мае пытаньне стварэньня пастаянных кадраў рабочых. Гаспадарчыя і саюзныя арганізацыі даготуль мала цікавіліся гэтай справай. Зараз трэба павярнуцца тварам да кадраў пастаянных рабочых, фарсаваць іх укамплектаваньне з тым, каб у кожным леспрамгасе працавала ня менш 100-150 рабочых - лесарубаў.

Вярбоўка павінна ісьці за лік батрацка-бядняцкай часткі вёскі, ня выключаючы са сваёй гаспадаркай. Рабочых трэба сканцэнтраваць у адным месцы з тым, каб па вечарох праводзіць сярод іх выхаваўчую работу.

Пастаянны рабочы павінен стаць сапраўдным пралетарскім касьцяком на чэрвені лешых рабочых для вылучэньня работу.

МЭХАНІЗАЦЫЯ ЗАГАТОВАК

Амаль нічога ня зроблена для мэханізацыі лесазагатовак. Асобныя леспрамгасы дабіліся некаторых посьпехаў. У Плешчаніцкім і Асіповіцкім леспрамгасах у лесе ўстаноўлены перанасныя заводзікі па распрацоўцы трэсак. Гэтыя посьпехі трэба пашырыць.

Вельмі дрэнна, што Саюзлеспрам зімога не адмяркае Лесбелу для мэханізацыі лесазагатовак, але ўсё-ж пры інвентарыце сакіх леспрамгасаў ёсьць поўная магчымасьць скарыстаць мясцовыя гонтарэзы, цыркуляркі і г. д.

Становішча з загатоўкам ірэў на ўсіх вучастках патрабуе чатае. Неабходна ўсю ўвагу аддаць гэтаму пытаньню, бо ігнараваньне дравазагатовак пагражае прарывамі ў апалавым балянсе краіны.

НА БРЫГАДНЫЯ МЭТАДЫ ПРАЦЫ

Адно з вострых пытаньняў—гэта недапушчальныя адносіны да арганізацый брыгад на песазагатоўках. БССР адстае ў гэтай галіне. Біна тут цалкам чадае на гаспадарчыя і саюзныя арганізацыі леспрамгасаў. Зусім нецярпіма такое зьявішча, калі пасобныя дзесятнікі выступаюць супроць брыгадных мэтадаў работы (Плешчаніцкі леспрамгас), а адміністрацыя не рэагуе на выступленьні канцэрватараў - дзесятнікаў. Брыгадны мэтад сябе зусім апраўдаў. Ён даў вялікі рост прадукцыйнасьці працы. Зьлёты ўдарнікаў павінны патрабаваць ад гаспадарчых і саюзных арганізацый рашучага і сьмелага пераходу на брыгадныя мэтады работы, прыцягваць да адказнасьці тых, хто арыпвае гэту справу.

Вялікае значэньне мае правядзеньне бальшавіцкай вясны ў леспрамгасах, поўнага ахопу ўсіх вольных вучасткаў, арганізацыі сваіх гародніх гаспадарак для забясьпячэньня пастаянных рабочых.

Трэба праверыць, ці ўсё зроблена ў гэтай справе, ці ёсьць насеньне, як падрыхтаваны леспрамгасы да летніх лесакультур, як падсочкі і г. д.

Бягомльшчына— перад сплавам

БЯГОМЛЬ. (Наш кар.). Брыгада рэдакцыі раённай газэты «КАЛГАСНЫ ЗМАГАР» нядаўна правяла абсьледаваньне падрыхтоўкі да сплаву па раёне.

На прыстані Вускрэм'е падрыхтоўка да сплаву пачалася яшчэ ў спрадвечнае сакавіка: была створана ўдарная брыгада з 28 калгаснікаў, якая праробіла вялікую работу па ўмацаваньні руму і загатовіла 4 тысячы штук вітак. Загатоўку вітак зрывае Бягомльскі вучлеспрамгас, які зусім ня цінавіцца гэтай справай, ня гледзячы на тое, што патрэбна ня менш як 50 тыс. штук вітак.

Горш стаіць справа на прыстані КАРЧАВАТКА. Забіўка палаў яшчэ ня скончана, вітакі не загатоўлены.

Пагражаючае становішча на адказным вучастку—НЯБЫШАНСКАЙ ПРЫСТАНІ, дзе сплаў пачнецца ў першую чаргу. Там зусім не адчуваецца наспіжаньне веснавой паводкі.

Бярэзінскі вучлеспрамгас толькі зараз думае пачаць умацаваньне палаў. Рэкорд бязьдзейнасьці пабіў Мсьціслаўскі вучастак, які вывез ня больш як 45 проц. заданьня па песе.

Трэба адзначыць дрэнную работу дзесятнікаў, якія з шумам разьязджаюць па вёсках, але нічога ня робяць, каб завербаваць рабочую сілу. Няма ўпіку завербаваных пытагонаў, між тым у раёне не хапае 1.000 рабочых. Лесасплаўная кантора знаходзіцца ў Барысаве, і ні адзін з яе прадстаўнікоў не паказваецца ў Бягомль.

На дапамогу сплаву павінны прыйсьці калгасы. Райкалгасаюз павінен зараз выявіць вольную рабочую сілу ў калгасах і мабілізаваць яе на сплаў.

ВІР.

Камсамольцы — на вывазцы лесу.

Вывазка лесаматар'ялаў ідзе нездавальняюча

Паводле даных Лесбелу да 11-га красавіка вывезена з лесу толькі [illegible] проц. заданьня па дзелавой драўніне.

Такім чынам, каля 2 млн. кубаметраў яшчэ ляжаць у лесе. Да чыгункі вывезена каля 1 млн. кубаметраў лесаматар'ялаў, а да сплаўных прыстаняй—толькі 1.760 тыс.

Лепш за ўсіх выканалі плян вывазкі ВІЦЕБСКІ і Рэчыцкі леспрамгасы (110,4 проц.).

Вельмі дрэнна ідзе вывазка па ТУРАЎСКІМ, ХОЙНІЦКІМ, ЧАЧЭРСКІМ, ЕЛЬСКІМ, ДРУЦКІМ, ГОРАЦКІМ ЛЕСПРАМГАСАХ, ЯКІЯ НЯ ВЫВЕЗЬЛІ НАВАТ 50 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ. Вельмі дрэнная становішча з вывазкай ДРОЎ. Гадавое заданьне па вывазцы выканана толькі на 36 проц. Да пунктаў сплаву даставлена каля 530 тыс. раўмэтраў.

Дрэнны ход вывазкі дроў стварае пагрозу забясьпячэньню прамысловасьці і рабочых цэнтраў дровамі. Пакуль не растаў сьнег, тэмпы вывазкі павінны быць фарсаваны.

Прафарганізацыі— у баку ад лесазагатовак

СЛУЦАК. (Наш кар.). У апошні час у рабоце Слуцкага леспрамгасу заўважаецца некаторы зрух. Перавыкананы плян загатовак будаўнічых матар'ялаў і дроў. Асабліва посьпехі дасягнуты па загатоўках дроў — звыш 176 проц. пляну.

Горш ідзе вывазка лесаматар'ялаў, вывезена ня больш 65 проц. патрэбнай колькасьці.

Удзел грамадзкіх арганізацый у лесазагатоўках зусім не адчуваецца. Ні адна з прафсаюзных арганізацый далёкуць ня стаяла пытаньня аб загатоўках лесу на пасяджэньнях і сходах.

Сельсаветы не правяраюць, як кулакі выконваюць заданьне па вывазцы лесу.

Спажывецкая кааперацыя зусім не аддае ўвагі забясьпяченьню лесарубаў прадуктамі і спэцпошкам. Гэта выклікае прагулы лесарубаў.

Слуцкі леспрамгас заключыў сацдагавор з Рагачоўскім леспрамгасам на поўнае выкананьне заданьня па вывазцы лесу.

Я. ЖЫЛКА.

Паведамленьні

ЗАЎТРА:

— У 13 гадз., у Культпроце ЦК адбудзецца пасяджэньне камісіі па парксьвеце пры аргбюро ЦК. Выклікаюцца т. т. Голавід, Гурвіч Ц., Яцкевіч, Улезаў, Макоўскі і Немец.

— У 19 гадз., у пам. Дому Камасьветы (пакой № 19, уваход з вул. Энгельса) адбудзецца групавая кансультацыя па пытаньнях падрыхтоўкі да кавання 1 мая па т. Менску. На кансультацыю павінны зьявіцца загадчыкі сэктароў агіт.-мас. работы партканцтываў і ячэек, заг. сэктароў культмасавай работы ФЗМК і заг. клюбаў, прадстаўнікі культпалітасьветаў клюбаў і культработнікі ЖАКТ'аў. Яўка абавязкова і без спазьненьня.

— Культпроп гаркому КП(б)Б у 19 гадз., у пам. гаркому (заля пасяджэньняў) оклікае нараду ўсіх апоргаў каваў з удзелам прадстаўнікоў гарПНА па культсетафэты.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА (Савецкая, 68)
Сёньня, 15-га красавіка—
ВЕЧАР ПАЭЗІІ МАКСІМА ЛУЖАНІНА
(УЗВЫШША)
1. Праца на месцы. 2. Як я пішу. 3. Як трэба пісаць. 4. Усё лепшае.
Пачатак у 7 гадзін. Уваход вольны.
388 Праўленьне Дому пісьменьніка.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
ДЗЬВЕ СІЛЫ
Зьвыш праграмы пошта. Пач. у 7 г. гукавы фільм 8 г. 45 м. і 10 гадз. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура"
Старац Васіль Гразноў
Хроніка № 13.
Пач.: 7 г., 8 г. 45 м., і 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал"
2-гі тыдзень 2-гі
Гістарычны фільм
Ледзяны дом

Кіно „Калгасны"
ПЯТ І ПАТАШОН у лепшай камэдыі ў 7 част.
ПАЧАТАК КАРЧЭРЫ.
2) ЗАМЖНЫ ПАХОД у 2 ч.
Пачатак у 6 г.

Кіно „Юны Піянэр"
ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ кіно-п'еса ў 6 част.
Кіно-хроніка № 16.
Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня.
Каса—з 11 г. 30 м.

Кіно „Спартак"
Нямецкі баевік ДРУГОЕ ЖЫЦЬЁ
Драма ў 8 частках.
Пач.: 7 г., 9 г., і 10 г. 45 м.
Каса—з 5 гадз.

БАН. СЕНЬНЯ у 7 гадзін вечара ў памяшканьні Інстытуту філязофіі БАН (пав. № 15)
АДБУДЗЕЦЦА
арацяг спэчак па дакладу т. Левіна „Матэдалёгія трацкізму".
Яўка членаў Інстытуту філязофіі АБАВЯЗКОВА
Уваход вольны.

Т-ва літаратуразнаўцаў і гісторыкаў марксыстаў.
16 красавіка, у Доме пісьменьніка, роўна ў 7 г. вен. адбудзецца
працяг аб'яднанага пасяджэньня т-ваў.
У ПАРАДКУ ДНЯ—працяг спрэчак па дакладу „Аб крытыцы курсаў беларускай літаратуры Піотухавіча і Гарэцкага".
Запрашаюцца настаўнікі, рабочыя літаратыкоўцы і студэнты.
Яўка—без спазьненьня.

СЕНЬНЯ у клюбе Гарсавету (Пляц Волі) адбудзецца
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ школьных ячэек МОПР'у і Юных Прыхільнікаў МОПР'у.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Даклад аб становішчы і задачах школьных ячэек МОПР'у і Ю. П. М.
2. Рапарты ячэек Юных Прыхільнікаў МОПР'у.
3. Аб падрыхтоўцы да Міжнароднага Дзіцячага Тыдню.
4. Мясцовая частка.
Мандаты выдаюцца штодзённа ў Менгаркоме МОПР'у (Савецкая, 87) і на месцах, дзе яшчэ не абраны дэлегаты, абрацца іх на агульных сходах.
Юнэнтар пры ЦК МОПР'у БССР.
Менгаркому МОПР'у
Менгарбюро ОКА.
371

Усім казпбюро і казпэрганізатарам
МЦРК 16-га красавіка роўна ў 6 гадзін вечара, у памяшканьні МЦРК (ленкутоў). Савецкая, 43, першы паверх.
склікаецца
АГУЛЬНЫ СХОД УСІХ ЧЛЕНАЎ КААПБЮРО
Парадок дня:
аб выдачы новых наборных картак.
З прычыны вялікасьці сходу, прапануецца пад асьцярогаю адказнасьці кожнага старшыні каапбюро ня запісьпечыць яму ўсяго каапактыву.
Увага: На асобных каапбюро абвесткі ня будуць пасылацца.
392 ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК.

ПЕРШЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД САЮЗУ РАБОТНІКАЎ ДЗЯРЖУСТАНОЎ
АДКРЫВАЕЦЦА
18-га красавіка ў 7 гадзін вечара ў памяшканьні клюбу саюзу гаслужальскіх (пог Камуністычнай і Энгельса).
Францыя зьезду адбудзецца ў 5 г. вечара тут-жа.
Рэгістрацыя дэлегатаў і выдача мандатаў будзе праводзіцца 17 і 18 красавіка ў аргбюро саюзу—Пляц Волі, Дом Працы, 3 паверх, 4 пакой.
387. Аргбюро.

ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЙ АСЬВЕТЫ
16 красавіка ў 7 гадз. вечара—адбудзецца
вечар для партыйнага, прафсаюзнага, гаспадарчага і камсамольскага актыву чыгуначнікаў.
1. Даклад нач. раёну т. В ільева аб ходзе рэалізацыі асновы СНК і ЦК УсеКП(б) аб паляпшэньні работы чыгуначнага транспарту па Менскім вузьле.
2. Канцэрт. Білеты па ячэйках.

Цэнтральнае выдавецтва народаў СССР пры прэзыдыуме ЦВК СССР «ЦЕНТРИЗДАТ»
Масква, Цэнтр., Нікольская, 10.
ДА ЎВАГІ ПАДПІСЧЫКАЎ
Выйшла і рассылаецца падпісчыкам часопісь № 1
„НАЦИОНАЛЬНАЯ КНИГА"
ЧАСОПІСЬ знаёмае за ідэалёгічную вытрыманасьць нацыянальнай кнігі, арганізуе маладзічную дапамогу аўтарам і перакладчыкам нацыянальнай кнігі, асьвятляе пытаньні выдавецкай справы і пашырэньня кнігі.
ЧАСОПІСЬ разьбіў на на цэнтральныя, мясцовыя нацыянальныя выдавецтвы, адзел і народной асьветы, аўтарскія калектывы і масавае настаўніцтва.
ЧАСОПІСЬ можна набыць на ўсіх кіёсках Саюздруку.
Падпісная цана: 10 №№ у год—3 рублі, розьнічная цана №—30 кап.
Падпіска прымаецца: Перыядсэктарам Цэнтравыдату, усім паштовымі аддзяленьнямі і лістаносьцямі.
Адрас выдавецтва: „Москва, Центр., Никольская, 10. Периодсектор Центриздата"

У МЕНСКУ АДКРЫВАЕЦЦА
ШКОЛА САЎГАСНАГА ВУЧНЁЎСТВА
ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ
СПЭЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК ЦРК
САДАЎНІКОЎ, ГАРОДНІКАЎ І ЖЫВЁЛАВОДАЎ
Школа арганізуецца на базе 4-5 груп сямігодкі і будзе камплектавацца з ліку дзяцей рабочых саўгасаў, калгаснікаў і бедняцкай вёскі. У першую чаргу ў школу павінны каманды: аваца брон-вучні прыгарадных гаспадарак. Паступаючыя ў школу павінны мець узрост ад 16-18 год.
Прынятыя ў школу будуць забясьпечаны зарплатай і інтэрнатам. Неабходна разам з заявай даслаць наступныя дакументы:
1. Запоўненую і заверэную анкету.
2. Пасьведчаньне аб сацыяльным, маемасным стане сям'і і праве голасу.
3. Аб узросьце. 4. Аб асьвеце. 5. Аб здароўі.
Усе азначаныя дакументы разам з заявай павінны быць накіраваны не позьней 20-IV—31 г. па наступным адрасе: Менск, Савецкая, 43-13. Менск, інструктару па кадрах. Да паведамленьня аб прыёме вызначаны канкурс. Менскі не павінны прыяжджаць.
370.
СЭКТАР КАДРАЎ МЦРК.

Сёньня, 15-IV, у 1 гадз. дня, у залі пасяджэньняў ЦСПСБ (Дом Працы, 2-гі паверх) адбудзецца НАРАДА ЗАГ. КУЛЬТСЭКТАРОЎ САЮЗАЎ, старшынь мастацка-літаратурных саветаў клюбаў, культарганізатараў, фабзаўмясцкомаў і рабочага актыву. Парадак дня: 1) аб перспэктывах работы беларускага аддзяленьня дзяржаўнага аб'яднаньня музыкі, эстрады і цырку («ГОМЭЦ'а»). Дакладчык — загалчык эстрадна-музычным сэктарам ленінградскага краявога кіно-тэатру «ГОМЭЦ'а» т. Краўзэ; 2) аб першамайскім абслугоўвальні калцэрт-ным сіламі.
Запрашаюцца рабочыя, служачыя і работнікі мастацтва.
391 Культсэктар ЦСПСБ. Беларадзяленьне «ГОМЭЦ'а».